Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 КРАСАВІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 74 (28941)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

УРОКІ ГАСПАДАРЛІВАСЦІ

МС

АЛЁ, НАРОД НА ПРОВАДЗЕ

5

СЛОВА — ЛІДАРУ

Сёння Прэзідэнт звернецца са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Традыцыйна мерапрыемства пройдзе ў Авальнай зале Дома ўрада. На яго запрошаны найвышэйшыя службовыя асобы краіны, члены ўрада, кіраўнікі органаў дзяржкіравання, найбуйнейшых прадпрыемстваў, ВНУ і банкаў, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса і СМІ.

У гэтым годзе на мерапрыемстве будзе асабліва шырока прадстаўлена беларуская грамадскасць. Гэта дэпутаты мінулых скліканняў, прадстаўнікі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», Беларускага саюза жанчын, студэнты ВНУ, курсанты ваенных навучальных устаноў, а таксама журналісты рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі.

У Пасланні будуць адлюстраваны асноўныя акцэнты ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны на цяперашнім этапе. Выступленне кіраўніка дзяржавы будзе транслявацца ў прамым эфіры па тэлеканалах «Беларусь 1», «Беларусь 24», Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Пачатак трансляцыі — у 10.30. Тэлеверсія Паслання будзе паказана ў вячэрнім эфіры тэлеканалаў.

КАРАТКА

- Бальнічныя арганізацыі 1, 7, 9 мая будуць працаваць па графіку святочнага дня, 4, 11 мая — па суботнім графіку, 5 мая — выхаднога дня, 6, 8, 10 мая — працоўнага дня.
- **Дзяржканталёры выявілі каля 1,5 тыс. парушэнняў на фермах і мехдварах.**
- Цэнтр па фігурным катанні Аляксея Ягудзіна адкрыты ў Мінску.
- **Viber рыхтуе версію месенджара на беларускай мове.**

ISSN 1990 - 763X

У БРЫГАДЗЕ ТОЛЬКІ ЖАНЧЫНЫ

Брыгада маляроў-аддзелачнікаў Мінскага будаўнічага ўпраўлення № 217, у якой працуюць толькі жанчыны, гэтымі днямі ўдзельнічае ў рэстаўрацыі знакамітага помніка архітэктуры — архірэйскага дома на Кастрычніцкай плошчы сталіцы, які быў вядомы яшчэ з пазамінулага стагоддзя. На здымку — Аксана БЯРОЗКІНА і Ірына ПРАКУДЗІНА. Гэтыя жанчыны — майстры сваёй справы, працуюць на будоўлі па некалькі дзесяцігоддзяў, сваёй працай яны ўпрыгожвалі такія значныя аб'екты, як Палац Незалежнасці, Нацыянальная бібліятэка, Вялікі тэатр оперы і балета, Палац Рэспублікі, інтэрнаты «студэнцкай вёскі», рэстаўравалі будынак мінскага цырка.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Спажывец

ШМАТРАЗОВАЯ ПАПЯРОВАЯ ВЫГАДА

Экалагічныя пакеты замест поліэтыленавых: у чым сіла?

Што аб'ядноўвае бары, хлебапякарні, цэментныя і цукровыя заводы, гандлёвыя сеткі, запраўкі, аэрафлот, курэй грыль, хотдогі і садавіну? Да ўсяго гэтага мае дачыненне папяровая ўпакоўка: тлушчаўстойлівая, ламінаваная, трывалая, экалагічная... Уласцівасці сучаснай паперы дазваляюць выкарыстоўваць яе ў самых розных выпадках. Айчынныя спецыялісты расказалі пра перавагі папяровай упакоўкі і паказалі яе магчымасці.

СТАР. 2

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Варта ўбачыць

«ВЫРАТАВАНКА» ДЛЯ ФАБЕРЖЭ

Мытня не дае дабро на вываз каштоўнасцяў

Брэсцкі музей выратаваных каштоўнасцяў можна назваць мясцовым Луўрам — калі ўвогуле дарэчы параўноўваць адну культуру з іншай. Таму, трапіўшы ў гэты абласны цэнтр, першым чынам мы накіраваліся ў «Выратаванку», як называюць яе экскурсаводы. Ад каго ж і што выратавалі ў музеі? Гэта творы мастацтва, затрыманыя калісьці на брэсцкай мытні. Іконы, распілаваныя на шэсць частак і запакаваныя ў бляшанку з-пад какавы, старажытнае велізарнае Евангелле, знойдзенае ў рэчах дыпламата, каштоўная парцэляна розных мануфактур. А яшчэ каштоўная антыкварная мэбля, творы Фабержэ, шматлікія карціны — у тым ліку Івана Айвазоўскага, Міхаіла Урубеля і Фернана Лежэ.

Фота Вікторыі ЛЯЎКОЎСКАЙ.

СТАР. 4

СЛУХАЕМ І ЧУЕМ

Беларусь зацікаўлена ў вопыце Дубайскага МФЦ пры стварэнні свайго міжнароднага фінансавага цэнтра

Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з кіраўніцтвам Дубайскага міжнароднага фінансавага цэнтра (МФЦ), на якой прысутнічалі кіраўнік цэнтра Эса Абдулфатах Казім і выканаўчы дырэктар Арыф Аміры.

«Дзякуй вам за ўсе добрыя словы, распачынанні і тую дапамогу, якую вы аказваеце нам. Я мяркую, што вы ўжо знаёмыя з нашымі марамі — гэта нават не праекты, а мары — стварыць нешта падобнае вашаму цэнтру ў Беларусі, — адзначыў Прэзідэнт. — І я буду вам вельмі ўдзячны, калі вы працягнеце сваю дабрачынную дзейнасць у Беларусі ў плане падтрымкі гэтага праекта і кансультацыйнай дапамогі нам, таму што ў вас велізарны неацэнны вопыт стварэння такіх міжнародных фінансавых цэнтраў».

Беларускі лідар звярнуў увагу, што Дубайскі міжнародны фінансавы цэнтр праяўляе вялікую цікавасць да супрацоўніцтва ў галіне ІТ-тэхналогій. «Вы шмат аддаяце ўвагі лічбавай эканоміцы, мы таксама займаемся гэтым сур'ёзна. І думаю, калі б мы здолелі знайсці агульную цікавасць, то гэта спалучэнне было б толькі на карысць развіцця лічбавай эканомікі, — падкрэсліў ён. — Словам, калі вы палічыце, што ў Беларусі ёсць вопыт высокіх тэхналогій, — мы да вашых паслуг, гатовыя працаваць разам».

У адказ кіраўнік цэнтра Эса Абдулфатах Казім падзякаваў кіраўніку дзяржавы за сустрэчу.

«І ўрад Дубая, і мы абавязуемся падтрымліваць гэты праект. З мінулага лета, пасля атрымання першых дакументаў наконт гэтага, мы прынялі рашэнне падтрымліваць супрацоўніцтва ў данай галіне, — заявіў ён. — Я не думаю, што гэта проста мара, я думаю, гэта нешта, што мы вельмі хутка рэалізуем. Мы прыехалі для таго, каб падзяліцца нашым вопытам, мы гатовыя да гэтага. Асабліва ў тым, што датычыцца стварэння і развіцця фінансавага цэнтра. І мы цалкам гатовыя ўносіць уклад у развіццё адносін паміж дзвюма дзяржавамі — і асабліва ў сектары ІТ».

Па выніках сустрэчы кіраўнік Дубайскага міжнароднага фінансавага цэнтра Эса Абдулфатах Казім пагутарыў з журналістамі.

Ён адзначыў, што з Прэзідэнтам яны абмеркавалі ідэю стварэння фінансавага цэнтра ў Мінску, а таксама тое, як вопыт аналагічнай структуры ў Дубаі можа спатрэбіцца ў Беларусі. «Мы і нашы беларускія калегі будзем прапрацоўваць гэтую ідэю, будзем вывучаць, наколькі гэта тэхнічна здзяйсняльна, наколькі гэта лагічна і эфектыўна. Як толькі будуць атрыманы нейкія вынікі, мы ўсё гэта абмяркуем. У тым выпадку, калі гэта сапраўды будзе разумна, мы гатовыя аказваць любую падтрымку ў стварэнні такога цэнтра», — падкрэсліў Эса Абдулфатах Казім.

Таксама бакі разгледзелі магчымае развіццё адносін паміж нашай краінай і ААЭ.

Кіраўнік МФЦ таксама расказаў, што ў апошні час у фінансавай сферы назіраюцца некаторыя змены, — гэта не ў апошнюю чаргу звязана з развіццём тэхналогій. «Мы ведаем, што ў Беларусі актыўна развіваюцца лічбавыя тэхналогіі. І мы лічым, што ў фінансавай сферы выкарыстанне такіх тэхналогій магло б прывесці да цікавых вынікаў, — дадаў ён. — Беларусь цалкам здольная зрабіць гэтую ідэю прывабнай, мы гатовыя працаваць і падтрымліваць яе».

Дарэчы, пазней стала вядома, што ўрад Беларусі і Дубайскі міжнародны фінансавы цэнтр падпісалі мемарандум аб узаемаразуменні.

Першы віцэ-прэм'ер Беларусі Аляксандр Турчын паведаміў журналістам, што ва ўрадзе створана рабочая група, якую ён узначальвае, вывучаецца адпаведны міжнародны вопыт, у тым ліку калег з Дубая. На яго думку, калі рабіць у нашай краіне традыцыйны фінансавы цэнтр, то нам будзе складана канкурыраваць з гігантамі рынку. «Таму мы хочам, каб у нашым цэнтры, калі мы будзем яго ствараць, была нейкая іскрынка, якая сёння звязаная менавіта з нашымі ІТ-тэхналогіямі», — адзначыў ён.

Аб канкрэтных тэрмінах стварэння гаворка пакуль не ідзе, будуць патрэбны сур'ёзныя заканадаўчыя змены. Дарэчы, беларускі МФЦ будзе арыентавацца на Усходнюю Еўропу.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

ДАВЕДКА

Міжнародныя фінансавыя цэнтры — гэта буйныя цэнтры з поўным комплексам фінансавых паслуг, сучаснымі разліковымі і аплатнымі сістэмамі, якія падтрымліваюць буйныя нацыянальныя эканомікі з развітымі і ліквіднымі фінансавымі рынкамі, дзе попыт і прапанаванне дыверсіфікаваныя, а заканадаўчыя і рэгулюючыя сістэмы здольныя забяспечыць цэласнасць адносін паміж суб'ектамі рынку і наглядальныя функцыі.

Дубайскі міжнародны фінансавы цэнтр быў створаны ў 2004 годзе, гэта сучасная фінансавая структура сусветнага значэння. Цэнтр займае 12-е месца сярод 102 міжнародных фінансавых цэнтраў.

Ён функцыянуе як фінансавая свабодная зона з мандатам на аўтаномію ад Цэнтральнага банка ААЭ, мае свой незалежны орган кіравання, уласны збор законаў, які заснаваны на англійскім праве, а таксама сваю судовую сістэму і сістэму падаткаабкладання.

Асноўныя напрамкі дзейнасці цэнтра: банкаўская справа, рынак капіталу, кіраванне актывамі і рэгістрацыя фондаў, кіраванне фондамі, перастрахаванне, дакументарнае афармленне і суправаджэнне гандлёвых аперацый.

Шматразовая папяровая выгада

СУХАРЫК ЦІ ЦВІЛЬ?

У Беларусі выгадная сітуацыя ў папяровай вытворчасці, лічаць эксперты. Наш рынак незалежны ад пастаўшчыкоў сыравіны. Мы самі нарыхтоўваем драўніну, робім цэлюлозу і вырабляем упакоўку. Цана ў экалагічнай упакоўкі ў 1,5—2—3 разы большая, чым у поліэтыленавай, але чым больш будзе ствараццa такой тары, тым меншай стане яе сабекошт. Цана ўпакоўкі напрамую залежыць ад кошту сыравіны для яе, у прыватнасці паперы, і раней розніца на карысць поліэтылену была не тры, а ўсе пяць, а то і шэсць разоў.

Вытворцы сцвярджаюць, што гатовы поўнасцю задаволіць патрабаванні айчыннага рынку папяровай тарай. У прыватнасці, у гэтым упэўнены на сямейным прыватным прадпрыемстве «Суперпак компані», дзе экалагічна чыстую ўпакоўку з паперы айчыннага гатунку вырабляюць ужо 20 гадоў, і пра вартасці такой тары 100 яго супрацоўнікаў ведаюць не па чутках.

— Хлеб у папяровым пакеце «дыхае». Так, праз пару дзён ён стане нагадваць сухарык, але ж застанецца ядомым, а ў поліэтыленавым — пакрыецца цвіллю, — сцвярджае **Вячаслаў ШАХ, старшыня савета дырэктараў кампаніі «Суперпак компані».** *— Акрамя таго, у прадуктах, якія больш як 40 хвілін знаходзяцца ў поліэтылене, з'яўляюцца небяспечныя для здароўя бактэрыі.*

Да таго ж большасць поліэтыленавай упакоўкі можна толькі выкінуць на звалку, а папяровую — перапрацаваць. І нават выкінутая ў смецце, яна поўнасцю раскладаецца цягам паўгода, а то і раней.

ЛАТКІ З МАКУЛАТУРЫ СУПРАЦЬ УСПЕНЕНАГА ПОЛІЭФІРУ

Акрамя папяровых пакетаў, айчынныя вытворцы робяць таксама кардонныя латкі для яек. Прадпрыемства «Зеленаборскае», што ў Смалявічах, вырабляе кардонныя кантэйнеры на 30 штук яек, якіх хапае, каб забяспечыць патрэбы ўсёй Беларусі. Як расказаў **Яўген САВАНЕЦ, дырэктар прадпрыемства**, тары на 10 штук яек штогод выпускаюць 8—10 мільёнаў адзінак. Калі дадаць да гэтага аналагічную прадукцыю, выраб якой наладжаны на фабрыцы «Спартак», то магутнасцяў двух прадпрыемстваў хопіць, каб задаволіць патрэбы ў кардоннных латках для яек ва ўсёй Беларусі. Аднак на практыцы толькі 10—15 % яек фасуюцца ў такую тару. Астатнія вандруюць у «абалонцы» з успененага поліэфіру, якая таннейшая ў паўтара раза. А наколькі больш шкодная?

Цяпер на «Зеленаборскім» распрацоўваюць латкі для яек на 20 штук, якія, як мяркуецца, з'явяцца на паліцах налета. А яшчэ робяць тару для садавіны, у асноўным альвеолы для ўпакоўкі яблыкаў, якія амаль цалкам спажывае Расія, а таксама тэхнічныя ўпакоўкі для дробных дэталяў, лямпачак, стартараў, генератараў і нават накладкі для тэлевізараў, якія ўстаўляюцца ў вялікія каробкі.

Біярасладаемая макулатурная папяровая сыравіна, якую можна перапрацоўваць і выкарыстоўваць пяць-сем разоў, перш чым яна стане адходамі, з улікам утылізацыі будзе абыходзіцца па цане амаль як і поліэтыленавая. Уся ўпакоўка на «Зеленаборскім» робіцца, дарэчы, з другаснай сыравіны. У Еўропе цяпер часта нават просяць пацвердзіць, што ўпакоўка зроблена з макулатуры, дадае Вячаслаў Шах.

— Выкананне Указа Прэзідэнта № 313 дазволіць айчынным вытворцам на роўных канкурыраваць з замежнымі пастаўшчыкамі ўпакоўкі. Дакумент рэгламентуе ўплату ўтылізацыйнага збору, аднак гэты момант пакуль не заўсёды кантралюецца і адсочваецца.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А гэта важна, бо тады пастаўшчыкі будуць больш адказна ставіцца да якасці імпартуемай прадукцыі.

Ён прывёў у прыклад неадпаведнасць цаны і якасці мяхоў з цэментам. Замежныя вытворцы, на яго думку, не закладваюць у свой тавар кошт утылізацыйнага збору, і ён становіцца ўжо прыкладна на 12 % меншым, чым у айчыннай упакоўкі. Разам з тым экспартныя мяхі часта проста рвуцца ў руках пакупніка, а беларускую ўпакоўку для цэменту выпрацоўвалі, скідваючы з вышыні каля трох метраў, і яна не рвецца нават пасля 7—8 падзенняў. Аднак падчас тэндара выйграе той, у каго меншая цана. І пытанне якасці, што закладваецца ў вытворчасць паперы, неабходна рэгуляваць на дзяржаўным узроўні.

БЯСПЕЧНА ДЛЯ ЕЖЫ

— Мы тлумачым людзям, наколькі экалагічна выгадна і важна набываць менавіта папяровую ўпакоўку, і гэта ж павінны рабіць і гандлёвыя сеткі. Калі падлічваць эканамічную розніцу ў вытворчасці папяровай тары і поліэтыленавай, трэба ўлічыць грошы, якія дзяржава траціць на лячэнне хвароб страўніка, — мяркуе Вячаслаў Шах.

Разам з тым патрабаванні да ўсіх відаў упакоўкі: папяровай, шкляной і поліэтыленавай — вызначаны заканадаўствам Еўразійскага эканамічнага саюза і ўпісаны ў тэхнічны рэгламент аб бяспецы ўпакоўкі. У нацыянальным заканадаўстве патрабаванні ўстаноўлены гігіенічным нарматывам, які зацверджаны пастановай Міністэрства аховы здароўя ў 2014 годзе і называецца «Гранічна дапушчальная колькасць хімічных рэчываў, якія выдзяляюцца з матэрыялаў, што кантактуюць з харчовымі прадуктамі», падзялілася **Вікторыя СПІРАНСКАЯ, галоўны спецыяліст аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя:**

— Упакоўка, якая выкарыстоўваецца для ядомых тавараў, павінна быць бяспечнай, якаснай і захоўваць прадукт цягам усяго трэміну прыдатнасці. Уся ўпакоўка праходзіць выпрабаванні на пэўныя патрабаванні ў акрэдытаваных лабараторыях, так што вытворцы і спажыўцы могуць быць упэўнены, што ўся ўпакоўка ў краіне адпавядае ўказаным патрабаванням.

У тлушчаўстойлівай паперы можна ўтрымліваць курыцу грыль, рыбу і іншыя прадукты і спакойна перапрацоўваць. Нават ламінаваная папяровая тара, якую апрацоўваюць спецыяльным растворам (а гэта робіць паперу настолькі гладкай, што яна не прапускае тлушч і вільгаць) прыдатная для ўтылізацыі. А вось поліэтыленавы пакет нельга перапрацаваць, хіба што «пасекчы» на фракцыі, якія больш ніяк не выкарыстаць далей, толькі спаліць. А вось папера падзяляецца на валокны, якія ў далейшым стануць гумусам, кажуць пра ўяўныя перавагі вытворцы папяровай тары.

ПЫТАННЕ НЕ НА КАПЕЙКІ

Эканамічных плюсоў ад папяровай тары таксама можна дасягнуць, і гэта павінны зрабіць мы самі, упэўнены **Міхаіл КАСЬКО, намеснік старшыні канцэрна «Беллеспаперпрам»:**

— Кошт папяровай упакоўкі з-пад цукру ці мукі ў агульнай цане прадукцыі — некалькі капеек. А калі гэтую ўпакоўку кінуць не ў смецце, а ў макулатуру, эфект ад яе перапрацоўкі і паўторнага выкарыстання будзе значна большы. Тым больш што сёння ў Беларусі сыравінай для вытворчасці 400 тысяч тон цэлюлозы, якую могуць за год выпускаць на Светлагорскім цэлюлозна-кардонным камбінаце, служыць нізкасортная драўніна хвойных парод. 100 тысяч тон з іх хопіць, каб забяспечыць усе патрэбы ўнутранага рынку. Гэта першы крок. Наступны робяць у Шклове, дзе вырабляюць рулоны паперы для ўпакоўкі. А далей ідзе ніша малога і сярэдняга бізнесу, якія з рулона — пад жаданні прыватных кліентаў: пякарні, крамы — зробяць папяровы пакет. Спажывец выкіне яго ў макулатуру, і ён адправіцца на перапрацоўку і далейшы выраб з другаснай сыравіны новых тавараў. І гэта рэальная работа, якая адбываецца цяпер, і ў нашых руках.

Ірына СІДАРОК.
Фота Андрэя САЗОНАВА.

КІТАЙСКІЯ ЖУРНАЛІСТЫ ЗНАЁМЯЦЦА З СІНЯВОКАЙ

Прадстаўнікі кітайскіх медыя з 15 да 20 красавіка гасцююць у нашай краіне, наведваючы розныя аб'екты як у беларускай сталіцы, так і ў рэгіёнах.

У рамках арганізаванага прэс-тура яны ўжо пабывалі ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень», рэсурсным цэнтры ЭкаТэхнаПарк — Волма, навукова-тэхнічным парку БНТУ «Палітэхнік». У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце кітайскія журналісты змаглі пазнаёміцца з адукацыйным працэсам на факультэце кітайскай мовы і культуры, пагутарылі з першым намеснікам міністра адукацыі Беларусі Ірынай Старавойтавай і кіраўніцтвам ВНУ.

Знаёмства з «адукацыйнай тэмай» працягнулася на гродзенскай зямлі, дзе ва ўніверсітэце імя Янкі Купалы вучацца суайчыннікі гасцей. Прычым на ўсіх узроўнях атрымання адукацыі: ад падрыхтоўчага аддзялення да аспірантуры. Акрамя таго, тут развіваюцца некалькі сумесных навуковых праектаў. Разам з тым вывучэнне мовы мае ўзаемны характар: каля 200 беларускіх студэнтаў вывучаюць кітайскую мову на розных узроўнях. Гэта могуць быць курсы ў кабінеце Канфуцыя ці вывучэнне кітайскай мовы як першай замежнай для студэнтаў, якія займаюцца на спецыяльнасці «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый».

Перавагі якаснай і натуральнай беларускай прадукцыі кітайскія госці змаглі ў літаральным сэнсе ацаніць на смак, наведаўшы прадпрыемствы «Малочны мір» і «Беллакт».

А з багатай культурна-гістарычнай спадчынай кітайскія госці мелі магчымасць пазнаёміцца бліжэй падчас наведвання замкавага комплексу «Мір» і пешай прагулкі па гістарычных мясцінах цэнтра Гродна.

На сустрэчы з кіраўніцтвам вобласці журналістаў больш за ўсё цікавілі пытанні супрацоўніцтва Гродзеншчыны з рэгіёнамі Кітая. Прадстаўнікі масмедыя змаглі даведацца, як рэалізуюцца з удзелам кітайскага капіталу чатыры інвестпраекты. У прыватнасці, кітайская кампанія выкупіла ў абласным цэнтры 16-павярховы будынак былой гасцініцы «Гродна». Зараз вядзецца яго рэканструкцыя: тут з'явяцца гатэль, рэстаран, гандлёвыя і офісныя памяшканні.

У СЭЗ «Гроднаінвест» таксама зарэгістраваны рэзідэнт з Кітая, які плануе рэалізацыю інвестпраекта ў сферы лагістыкі. Гэты напрамак супрацоўніцтва — адзін з самых перспектыўных, адзначыў на сустрэчы старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў, паведамляе БелТА.

У Гродне таксама адкрыты цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны і гандлёва-выставачны цэнтр, дзе прадстаўлены тавары з Кітая. Праекты рэалізуюцца сумесна з партнёрамі з кітайскай правінцыі Ганьсу, з якой Гродзенскую вобласць звязваюць пабрацімскія адносіны.

— Кітай у апошнія гады для рэгіёна важны гандлёва-эканамічны партнёр. Планы па развіцці супрацоўніцтва ў нас дастаткова вялікія. Па выніках 2018 года тавараабарот склаў каля 200 мільёнаў долараў. Магчыма, лічба і не самая вялікая, аднак адзначаем штогадовы рост гэтага паказчыка. Усё больш і больш прадпрыемстваў рэгіёна наладжваюць сувязі з кітайскімі партнёрамі, — адзначыў Уладзімір Краўцоў.

Ён падкрэсліў, што дынамічна развіваюцца адносіны ў адукацыі і культуры. Яшчэ адна перспектыўная сфера супрацоўніцтва — турызм.

Знаёмства з Сінявокай працягваецца.

НА СУВЯЗІ З УЛАДАЙ

20 красавіка ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме адбудуцца традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі. У суботу з 9.00 да 12.00 на званкі адкажуць:

старшыня БРЭСЦКАГА абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Гатоўнасць па ўсіх напрамках

Пасяджэнне Рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні II Еўрапейскіх гульняў 2019 года прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Румаса.

На пасяджэнні быў разгледжаны ход работ па падрыхтоўцы аб'екта для арганізацыі харчавання ўдзельнікаў II Еўрапейскіх гульняў у Вёсцы спартсменаў. Таксама заслуханы даклады пра гатоўнасць Нацыянальнага алімпійскага стадыёна «Дынама» да правядзення мерапрыемстваў Гульняў, добраўпарадкаванне тэрыторыі Мінска, рамонт дарог, тратуараў, прывядзенне ў належны стан будынкаў. Акрамя таго, разгледжаны пытанні прыцягнення сцюардаў да правядзення Гульняў і культурная праграма форуму.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ЗГАРЭЎ ХРАМ

з-за спальвання смецця

Удзень у цэнтр аператыўнага кіравання Гарадоцкага падраздзялення МНС ад мужчыны паступіла паведамленне: гарыць храм у вёсцы Рамні.

Калі да месца выкліку праз восем хвілін прыбылі ратавальнікі, будынак палаў адкрытым полымем. Па інфармацыі МНС, храм не эксплуатаваўся больш за 30 гадоў. Дах у будынка быў драўляны (дранка) на такіх жа латах, вокны былі закалочаны. Згодна з папярэднімі звесткамі, храм Святых апосталаў Пятра і Паўла 1896 года пабудовы ў 1998 годзе быў перададзены Віцебскаму епархіяльнаму ўпраўленню праваслаўнай царквы.

Установлена, што полымя перакінулася на будынак у выніку неасцярожнага абыходжання з агнём пры спальванні смецця — перайшло на сухую расліннасць. Ніхто не пацярпеў. У выніку пажару знішчаны дах храма, столевае перакрыцце, пашкоджаны сцены будынка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сталічны ЧАС

● Да канца мая транспартны парк Мінска папоўніцца 328 аўтобусамі і 60 электробусамі, большая частка тэхнікі ўжо паступіла. Пра гэта паведаміў першы намеснік генеральнага дырэктара ДП «Мінсктранс» Алег ДЗЮБЕНКА, перадае БелТА. «Гэтая тэхніка будзе задзейнічана ў тым ліку ў абслугоўванні II Еўрапейскіх гульняў. На сённяшні дзень мы атрымалі 283 аўтобусы. Таксама паступілі 28 доўгіх электробусаў падвышанай ёмістасці і тры кароткія. Да канца мая павінны атрымаць яшчэ 25 кароткіх электробусаў», — сказаў Алег Дзюбенка. Усяго ў Мінску ёсць 137 трамваяў, 801 тралейбус і 1560 аўтобусаў. Сярэдні ўзрост тралейбусаў і аўтобусаў — 9,5 года (пры тэрміне службы 10 гадоў), трамваяў — 11 гадоў (пры тэрміне службы 15).

● Культурна-забаўляльныя праграмы аднавіліся на танцавальнай верандзе «Сустрэча» ў мінскім парку культуры і адпачынку ім. Чалюскінцаў, паведамілі БелТА ва ўпраўленні «Гарадскія паркі» УП «Мінскзялёнбуд». Танцпляцоўка ў парку Чалюскінцаў — папулярнае месца адпачынку гараджан. Кожны танцавальны вечар збірае ад 500 да 800 чалавек 45 гадоў і старэйшых. Самаму пажылому госцю споўнілася 92 гады. Адзіная ў горадзе адкрытая танцавальная веранда дзейнічае ў парку Чалюскінцаў з 1979-га. У ліпені мінулага года яна адкрылася пасля рэканструкцыі.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Пакістане пры нападзенні на аўтобус загінулі 14 чалавек

На поўдні Пакістана ў правінцыі Белуджыстан у выніку нападзення на аўтобус загінулі 14 чалавек, паведамляе мясцовы тэлеканал Geo TV.

Напад адбыўся на прыбярэжнай шашы Макрана, якая злучае гарады Карачы і Гвадар. Паводле інфармацыі тэлеканала, група ўзброеных асоб спыніла аўтобус, запатрабавала ў пасажыраў дакументы, а затым застрэліла 14 чалавек.

Пакуль невядома, кім былі тыя, хто нападаў. Праводзіцца расследаванне.

Guardian: тронная прамова каралевы Вялікабрытаніі можа быць адкладзена з-за брэксіту

Тронная прамова каралевы Вялікабрытаніі Лізаветы II на адкрыцці сесіі парламента (звычайна ў маі або чэрвені) можа быць адкладзеная на больш позні тэрмін у сувязі з тым, што здзелка прэм'ера Тэрэзы Мэй з Бруселем па выхадзе з ЕС застаецца заблакаванай у найвышэйшым заканадаўчым органе краіны. Пра гэта паведамляе газета The Guardian са спасылкай на ўрадавыя крыніцы.

Паколькі каралева «ўладарыць, але не кіруе», яе тронная прамова адлюстроўвае не асабістыя погляды манарха, а палітыку партыі ці партый, якія знаходзяцца ва ўладзе. Тэкст выступлення складае кабінет міністраў, і каралева не мае права ўносіць у яго якія-небудзь змены. Галоўны пункт парадку дня на гэты момант — гэта брэксіт, і з улікам цяперашняй сітуацыі, па даных крыніц, «няма ніякіх планаў на найбліжэйшую перспектыву» апублікаваць праграму дзеянняў урада без адабрэння гэтага курса парламентам.

У той жа час выданне прыводзіць меркаванне прадстаўніка канцылярыі прэм'ера, па словах якога было б некарэктна гаварыць аб тым, што выступленне манарха адкладаецца, паколькі ніякай афіцыйнай даты не прызначана.

Экс-прэзідэнт Перу скончыў жыццё самагубствам у час затрымання

Былы прэзідэнт Перу Алан Гарсія стрэліў у сябе падчас спробы затрымання паліцыяй паводле рашэння суда па справе аб карупцыі, паведамляе французскае інфармагенцтва AFP. З кулявым раненнем ён быў дастаўлены ў шпіталь Лімы, але ўрачам не ўдалося выратаваць яму жыццё.

Алан Гарсія займаў пасаду прэзідэнта два тэрміны: з 1985-га да 1990 года і з 2006-га да 2011 года.

Як адзначае ТАСС, у лістападзе мінулага года суд забараніў Гарсія пакідаць краіну на працягу 18 месяцаў. На думку следства, палітык мог атрымаць $100 тысяч ад Odebrecht у абмен на дапамогу ў заключэнні выгадных для кампаніі кантрактаў. Былы кіраўнік дзяржавы сваю віну адмаўляў. З 17 лістапада да 3 снежня 2018 года ён хаваўся ў пасольстве Уругвая, аднак пасля таго, як яму было адмоўлена ў забеспячэнні прытулку, ён пакінуў рэзідэнцыю.

Цяперашні прэзідэнт Перу Марцін Віскара ў «Твітэры» выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю Алана Гарсія.

Надвор'е

Сонечна, але месцамі дожджык

У выхадныя будзе цёпла — да плюс 19 градусаў

Скандынаўскі антыцыклон на гэтым тыдні ўпарта ўтрымліваў уплыў на надвор'е ў нашай краіне. Атмасферныя франты, якія ссоўваліся па яго перыферыі, закранулі ў асноўным паўднёвыя раёны краіны. Таму найбольш істотныя ападкі прайшлі па паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці. А вось па начах месцамі тэмпература паніжаецца да слаба адмоўных значэнняў. Удзень паветра добра выграваецца і тэмпературны фон утрымліваецца на 1—4 градусы вышэй за кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У апошні дзень працоўнага тыдня надвор'е будзе па-ранейшаму вызначаць антыцыклон, але ўжо ў выхадныя дні яго ўплыў аслабее. Тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам малаактыўных атмасферных франтоў, так што месцамі не абыдзецца без дажджоў. Сёння ўдзень будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 12 да плюс 17 градусаў, па захадзе краіны паветра прагрэецца да 19 цяпла.

У ноч на суботу будзе пераважна без ападкаў. Раніцай і ўдзень атмасферны фронт прынясе месцамі па краіне кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы ў асноўным складзе 1—6 цяпла, але пры праясненнях месцамі панізіцца да нуля — мінус 3 градусаў. Удзень тэмпература будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 11 градусаў па паўночным усходзе да 19 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. У нядзелю пад уплывам франтальнага раздзела месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да 7 цяпла, удзень па краіне будзе ад плюс 11 да плюс 18 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак уначы і раніцай месцамі па паўднёва-заходняй частцы краіны не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў. Удзень тэрыторыя нашага рэгіёна апынецца пад уплывам антыцыклону з цэнтрам над еўрапейскай тэрыторыяй Расіі. Будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, удзень будзе ад плюс 12 да плюс 18 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

«ВЫРАТАВАНКА» ДЛЯ ФАБЕРЖЭ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Рэчы, прадстаўленыя ў брэсцкім музеі выратаваных каштоўнасцяў, перадавалі з мытні пачынаючы яшчэ з 1953 года. Дарэчы, акурат тады, у 1950-я гады, затрымалі адразу 30 ікон! Музея яшчэ не было: яго адкрылі толькі ў 1989 годзе. Але ў фонды Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея ўвесь час паступалі прадметы з мытні. Таму пазней вырашылі стварыць асобны музей такой тэматыкі.

У дзень адкрыцця музея перагарадзілі ўсю вуліцу Леніна, згадваюць відавочцы тых падзей. Было столькі груп наведвальнікаў, што музей працаваў да 10 гадзін вечара.

Першая зала акурат прысвечана самой брэсцкай мытні. Тут можна ўбачыць розныя патайнікі. Напрыклад, скрынка ад абутку служыла патайніком для чатырох ікон: вонкава яна не прыцягвала ўвагі, унутры была запячатана фольгай, па вазе адпавядала свайму стандарту. Таму вызначыць, што ў ёй кантрабанда, было нялёгка, аднак гэта ўдалося зрабіць. Побач у экспазіцыі можна ўбачыць цукерніцу — сценка ў ёй ссунутая, а ўнутры відаць старыя сярэбраныя манеты.

У музеі ёсць прылада, якая вызначае вадзяныя знакі: яе падключаюць да сеціва, загараюцца два промні, чырвоны і сіні, — і вось ужо справа на банкноце праяўляецца партрэт Кацярыны II.

У наш час тэхналогіі прасунуліся далёка наперад і вельмі дапамагаюць мытнікам у іх справе. Так, сёння выкарыстоўваецца сканаванне велікагрузных машын. Гэты працэс дазваляе выявіць зброю, наркотыкі, антыкварыят. Знайшоўшы каштоўныя прадметы, мытнікі перадаюць іх для судовага разбору. Затым рэчы паступаюць у музеі нашай краіны, у тым ліку ў музей выратаваных каштоўнасцяў.

Распілаваныя іконы...

Даволі значную частку экспазіцыі займаюць старыя іконы. Яны часта траплялі ў музей у распілаваным выглядзе: некаторыя з іх распілоўвалі нават на шэсць частак. Аднак сучасныя спосабы рэстаўрацыі дазваляюць аб'яднаць іх усе, прычым без зрухаў.

Перад тым як вывезці ікону, чалавек мог даволі доўга чакаць зручнага моманту: адна з ікон у распілаваным выглядзе ляжала 25 гадоў.

Такія творы традыцыйна пішуцца на дрэве. У музеі ёсць старая ікона XVI стагоддзя, якая была знойдзена ў кантрабандыстаў у 1960-я гады. Часта такія іконы везлі з храмаў, магчыма, нават з алтароў. Сярод асабліва каштоўных — абраз Божай Маці Уладзімірскай. Па тыпе напісання гэта Елеуса — на правай руцэ жанчына трымае немаўлятка Ісуса Хрыста, які пяшчотна прыціскаецца да шчакі маці.

Яшчэ адна асабліва каштоўная ікона ў экспазіцыі музея — Спас у Сілах. Яна прадстаўлена пасля рэстаўрацыі, а датуецца таксама XVI стагоддзем.

У калекцыі ёсць і вельмі цікавы іканастас, затрыманы ў фургоне. Дарэчы, такія прадметы даволі часта спрабуюць вывезці ў фурах, хаваючы сярод асабістых рэчаў. У свой час гэты іканастас склалі — ён атрымаўся невялікага памеру — і так спрабавалі перавезці. Аднак нейкім дзівосным чынам Аляксандр Круковіч (вядомы мытнік, які ўжо пайшоў з жыцця, але паспеў раскрыць шмат тайнікоў) адшукаў яго ў фургоне. Іканастас датуецца XIX стагоддзем, ён трохрадны.

У цэнтры адной з залаў — вялізнае Напрастольнае Евангелле. Гэта царкоўная кніга, якая была знойдзена ў 1960-х гадах у рэчах дыпламата. Аклад датуецца 1761 годам, выкананы ў Санкт-Пецярбургу. Пад прыгожым сярэбраным акладам усе старонкі ў поўнай захаванасці — агулам іх каля 300. Напісана кніга на царкоўнаславянскай мове двухкаляровым ручным друкам, і ўсе літары ўпрыгожаны раслінным арнаментам.

І Фабержэ!

Як працавалі ювелірныя майстэрні ў XIX стагоддзі? Адразу ўспамінаецца фірма Фабержэ, якая паспяхова працавала з 1842 года да 1917-га. Фабержэ стваралі калекцыі па сезонах і прадавалі іх у крамах. Калі калекцыя не распрадавалася цалкам, яе забіралі, перапрацоўвалі і рабілі зусім іншую

калекцыю. У фірме працавала каля дзесяці майстроў — іх імёны ўвайшлі ў гісторыю ювелірнага мастацтва.

У брэсцкім музеі ёсць нефрытавы нож ад Фабержэ — ручка выканана з серабра, а лязо — зялёны нефрыт — з уральскіх самацветаў. Гэта нож для разразання паперы, яго выкарыстоўвалі, каб адкрываць лісты. Побач запалачніца ў выглядзе невялікага грыба. Унутры стаялі запалкі, аб грыб, зроблены з серы, яны падпальваліся: падстаўка з'яўляецца дзейнай. Такіх грыбоў Фабержэ выпусцілі даволі шмат.

Ёсць і туалетныя прылады легендарнай фірмы: флакон для парфумы, пудраніца, скрыначка, ваза ручной работы. Тулава вазы ўпрыгожана алмазнай рэззю, якой займаліся майстры на шкляным заводзе ў Рызе. У экспазіцыі можна ўбачыць прыгожыя вазы для садавіны, графіны, цукарніцы — альянс Фабержэ і рыжскіх майстроў.

Усход — справа тонкая

Паўночны Каўказ прадстаўлены выстаўкай кінжалаў, жаночымі і мужчынскімі паясамі, якія служылі для ўпрыгожвання нацыянальных касцюмаў. Калі прыгледзецца, на жаночых паясах можна ўбачыць манеты, аднак па вазе паясы даволі лёгкія. На манетах пазначаны даты — XIX стагоддзе.

Зала Усходу прадстаўляе чатыры краіны — Манголію, Узбекістан, Японію і Кітай. У цэнтры экспазіцыі — адметныя японскія вазы. Адна з іх выканана з бронзы, а зверху пакрытая фаянсам і эмалевымі роспісамі, у тым ліку пазалотай. Кітайскія вазы зроблены ў тэхніцы перагародчатай эмалі.

Чаканны посуд майстроў Узбекістана таксама выклікае захапленне. Напрыклад, пасудзіны для захавання вады, зерня, масла. Ёсць і два японскія скруткі, напісаныя на шоўку.

Парцэляна з ляпнінай

Парцэлянавыя ваза для садавіны і камінны гадзіннік зроблены на нямецкім заводзе больш за 100 гадоў таму — на першай мануфактуры, заснаванай у 1709 годзе пад маркай Майсен. Што ж уяўляла сабой традыцыя Майсена? Першапачаткова прадметы былі белымі, але іх пакрывалі ляпнінай — тонкімі кветкамі, скульптурамі людзей і звяроў, пазней парцэляну часам яшчэ і распісвалі.

Другой па значнасці ў Еўропе была мануфактура Вены. Яна славілася тым, што на прадметах выконвалі творы мастацтва, нават уручную капіравалі шэдэўры сусветнага жывапісу.

Ёсць у музеі і паліцы для захоўвання парцэляны, даволі незвычайнай формы. Датуюцца яны канцом XIX стагоддзя. Выкананыя з масіву сасны, зверху пакрытыя шпонай з розных парод дрэва. Дзве такія паліцы былі затрыманыя ў 1973 годзе ў людзей, якія эмігравалі ў Ізраіль. Іншая мэбля гэтай экспазіцыі — стол-бюро для дакументаў, стол-бюро для посуду ў кітайскім стылі — былі затрыманыя ў 1993 годзе ў фуры, якая ішла з Латвіі ў Германію ўначы праз Брэст. У гэтай фуры, акрамя прадметаў мэблі, знаходзілася вялікая партыя кантрабанды. Усе прадметы трапілі ў фонды музея выратаваных каштоўнасцяў — таксама там знаходзіліся карціны, якія ўяўлялі сабой скручаныя ў трубачку палотны.

Пасля знаходжання карцін у такім выглядзе іх, вядома, рэстаўруюць, нацягваюць на падрамнік і ўстаўляюць у раму — каб зноў можна было ўбачыць твор.

Найлепшы сярод марыністаў

Адна з работ, прадстаўленая пасля рэстаўрацыі, — аўстрыйскага мастака Шонберга, 1916 года. Гэта выдатны партрэт маці і дзіцяці, на якім можна ўбачыць вельмі тонкае пісьмо дзіцяці — не кожнаму мастаку ўдаецца так жыва напісаць партрэт немаўляці. Прадстаўлены партрэт дзяўчынкі з ружовым бантам 1900 года — аднак гэта карціна моцна пацярпела, палатно парвалася, фарба ў некаторых месцах пасыпалася.

Ёсць асобная пейзажная зала. Адна з затрыманых карцін адразу была ў раме — гэта праца Юлія Клевера «Пейзаж ля возера». У 1993 годзе яна была схаваная ў фургоне. Клевер — даволі вядомы пейзажыст, яго палатно персанальна набыў Аляксандр III, і яго карціны на аўкцыёнах каштуюць даволі дорага.

У зборах музея ёсць творы вядомага марыніста Івана Айвазоўскага. Прадстаўленыя карціны Айвазоўскі пісаў для ўпрыгожвання кабінета за 2-3 гадзіны па памяці. За сваё жыццё мастак напісаў каля шасці тысяч палотнаў. Асабліва добра ў яго атрымлівалася выяўляць месяцавае святло і яго адлюстраванне на вадзе і скрозь ваду — акурат гэта відаць на карціне «Марскі пейзаж».

Таксама ў брэсцкім музеі можна ўбачыць работы Міхаіла Урубеля, Фернана Лежэ і многіх іншых адметных мастакоў. Зрэшты, кожны знойдзе ў «Выратаванцы» тое, што зацікавіць менавіта яго.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота Вікторыі ЛЯЎКОЎСКАЙ.
г. Брэст.

Годовой отчет за 2018 год
ООО «Санта Ритейл»
Годовой бухгалтерский баланс за 2018 год утвержден на очередном общем собрании участников ООО «Санта Ритейл» 29.03.2019 года (протокол № 12).

Бухгалтерский баланс на 31.12.2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

Активы	Код строки	На 31.12.2018	На 31.12.2017
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	80667	51248
Нематериальные активы	120	1930	1118
Вложения в долгосрочные активы	140	10079	2841
Долгосрочные финансовые вложения	150	65078	2377
Прочие долгосрочные активы	180	39	
ИТОГО по разделу I	**190**	**157793**	**57584**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	20667	14687
в том числе: материалы	211	1089	801
готовая продукция и товары	214	19578	13886
Расходы будущих периодов	230	325	175
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	2185	548
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	5390	2767
Краткосрочные финансовые вложения	260	27904	14370
Денежные средства и их эквиваленты	270	7617	5451
ИТОГО по разделу II	**290**	**64088**	**37998**
БАЛАНС	**300**	**221881**	**95582**
Собственный капитал и обязательства	**Код строки**	**На 31.12.2018**	**На 31.12.2017**
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	54288	34288
Резервный капитал	440	15	15
Добавочный капитал	450	3570	1950
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	10010	7024
ИТОГО по разделу III	**490**	**67883**	**43277**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	109099	20693
Отложенные налоговые обязательства	530	95	45
Доходы будущих периодов	540		2
ИТОГО по разделу IV	**590**	**109194**	**20740**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610		400
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620		600
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	44802	30561
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	40196	28853
по авансам полученным	632	7	6
по налогам и сборам	633	196	127
по социальному страхованию и обеспечению	634	315	232
по оплате труда	635	1226	865
по лизинговым платежам	636	2616	438
прочим кредиторам	638	246	40
Доходы будущих периодов	650	2	4
ИТОГО по разделу V	**690**	**44804**	**31565**
БАЛАНС	**700**	**221881**	**95582**

Отчет о прибылях и убытках за январь–декабрь 2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2018	За январь – декабрь 2017
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	286268	220336
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(235340)	(180679)
Валовая прибыль (010-020)	030	50928	39657
Управленческие расходы	040	(5356)	(3566)
Расходы на реализацию	050	(52208)	(37426)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	(6636)	(1335)
Прочие доходы по текущей деятельности	070	13079	5978
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(1608)	(1680)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080)	090	4835	2963
Доходы по инвестиционной деятельности	100	10894	4837
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	5277	3577
проценты к получению	103	2771	93
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	2846	1167
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(7315)	(3693)
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(6863)	(3669)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(452)	(24)
Доходы по финансовой деятельности	120	4778	17
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	4778	17
Расходы по финансовой деятельности	130	(9875)	(876)
в том числе: проценты к уплате	131	(2967)	(820)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(6906)	(53)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(2)	(3)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	(1518)	285
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	3317	3248
Налог на прибыль	160	(279)	(486)
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	(51)	(18)
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(1)	(1)
Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200)	210	2986	2743
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	1620	
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	4606	2743

По аудиторскому заключению от 25 марта 2019 года аудиторской организации – ООО «Аудиторский центр «Эрудит» *(220116, г. Минск, проспект газеты «Правда», 11 А, первый этаж офисного модуля А, кабинет 2, свидетельство о государственной регистрации зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191404329 решением Минского городского исполнительного комитета от 26.04.2010)* годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Санта Ритейл» по состоянию на 31 декабря 2018 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь

НАШ ХЛОПЕЦ!

Пра суседнюю вёску Ляхаўцы берасцейскі пісьменнік Аляксей Філатаў пісаў, што мянушак там — пад дзве тысячы ў самім сяле і безліч па-за ім, што набывалі іх усе, хто тут нарадзіўся альбо пабываў. Набывалі, зазначу, раней, потым — перадавалі ў спадчыну ад дзядулі да ўнука.

Але ж ёсць сярод мянушак і новыя, народжаныя нядаўна.

...Значыцца, пачатак 1980-х. Танцаў у клубе хлопцам замала — патрэбен працяг. На «мінскачах», «іжах» ды «явах» яны стальной кавалькадай нясуцца ў суседнія вёскі Хаціслаў ці Макраны — вядуць «разборкі» з мясцовымі. Гэта значыць, у танцавальнай зале выключаюць святло і пачынаюць так званы «махач»: б'юць чужых, б'юць сваіх, бо ў цемры хіба разбярэш, хто ёсць хто... Выручае толькі голас.

Вось і ў той вечар, адчуўшы сілу ўдараў, наш Валодзька зразумеў, што б'юць яго не чужыя — свае, і ад крыўды на ўсю моц закрычаў:

— Хлопцы, не біце, я — ва-а-аш!..

На гэтым бойка скончылася — агульным рогатам, братаннем і... нараджэннем новай мянушкі. Валодзю празвалі «Вашыкам», на што хлопец ніколі не крыўдзіўся, бо здабыў мянушку ў баі, хоць і мясцовага значэння.

Генадзь Мішчук,

в. Вотчына, Маларыцкі раён.

У КАГО ШТО БАЛІЦЬ...

У нашай бухгалтэрыі працуюць дзесяць жанчын. Мы, ушасцёх, займаем адзін вялікі пакой і адна адной, як быццам, не замінаем: неяк прыстасаваліся. Хоць прыгоды, вядома ж, здараюцца.

У апошнія гады перасталі, напрыклад, хадзіць у сталоўку (хоць яно і добра было: і пройдзешся трохі, і гарачага супу з'ясі...). Цяпер — бяром так званыя ссабойкі ці тармазкі ды п'ём якую кавугарбату. А ў астатні абедзенны час — нехта бегае па крамах, нехта чытае ці размаўляе...

У той дзень я сядзела ў інтэрнэце. Насмарк даняў — шукала там новы сродак. Непадалёк, за суседнім сталом, пра нейкія хваробы гаварылі і Вольга з Наташай — дзве нашы бухгалтаркі. Але я іх, можна сказаць, не чула — думала пра свой гаймарыт, аж пакуль не данеслася:

— А найлепшы сродак — гэта холад! Так мая бабуля казала...

(Яна, тая бабуля, па словах ўнучкі, працавала ваенным хірургам, ледзь не да Берліна дайшла! Таму я, ну вядома ж, адарвалася ад камп'ютара — стала слухаць жанчын.)

— У вайну, — «цытавала» бабулю Наташа, — яго і наогул ледзяшамі лячылі.

— Дык гэта ж зімой, — перабіла яе сяброўка, — а ў іншы час?

— У іншы — бабуля казала — прамыванні добра... Цёплай мачой...

— Ну ты скажаш!.. Яна ж у рот зацячэ, — скрывілася я.

— З чаго б гэта? — паглядзела на мяне Наташа.

— Дзе той рот, а дзе... — уставіла слоўца Вольга.

І тут ужо я залыпала вачыма:

— Дык вы пра што там гаворыце?

— Мы — пра гемарой.

— А ты?

— Я — пра гаймарыт.

Вось такія ў нас дзве хваробы. «Далекаватыя» па месцы знаходжання, блізкія па гучанні і, відаць, аднолькава непрыемныя.

Л. С.

г. Асіповічы.

РАЗЛІК РАЗЛІКУ РОЗНІЦА

Гэта было на пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Знаёмы студэнцкі будатрад паехаў на Магілёўшчыну ўзводзіць так званую малочнатаварную ферму. Непадалёк ад яе размяшчалася вёска — вялікая, але ж досыць глухая: у хаце, дзе пасялілася моладзь, тэлевізара і таго не было, што ўжо казаць пра нейкі клуб, кавярню, лазню... Да рэчкі таксама вярсты з чатыры. «Пакуль з работай справімся, — перажывалі хлопцы, — здзічэем!» Для таго, каб тое не сталася, вырашылі скончыць аб'ект як мага раней: працавалі на поўную выкладку з шасці гадзін раніцы да дзесяці вечара, без ніякіх выхадных. Калгаснае начальства, назіраючы за работай, нацешыцца не магло.

Але ж праз нейкі час здарыўся ў студэнтаў і першы вялікі збой: цэмент не прывезлі і ў адзін дзень, і ў другі, і ў трэці... Хлопцы дома сядзелі, што называецца, лынды білі, хто-ніхто па вёсцы слоняўся — у пошуках прыгод. І двое — нават знайшлі. Спыніла іх бабуля-«божы дзьмухавец», «адважыла» пару кампліментаў, сказала:

— Хлопцы, вы такія працавітыя, такія малайцы!.. Калі час маеце, то можа закалыміце?.. Мне дровы трэба пасекчы... Прычэп, невялічкі... А я і накармлю вас, і заплачу...

Студэнты, пераглянуліся: маўляў, жанчына старэнькая — грэх адмовіць... І таму закасалі рукавы!

Цэлага паўдня яны шчыравалі — пад потам, ад душы, але ж «прычэп» той пасеклі!..

Недзе пад канец, праўда (ведама, галодныя), сталі прыслухоўвацца, ці не запахла з хаты добрай яечняй, ці не ідзе гаспадыня паклікаць за стол?.. Не чуваць, як быццам? «Старэнькая... Мусіць, не паспела?» — падумалі хлопцы і далі ёй яшчэ трохі часу: пакуль дровы ў паветку складуць.

Хораша ў іх атрымалася — акуратненька. Бабуля палюбавалася, пахваліла, а потым кажа:

— Вось вам, хлопчыкі, і разлік — 24 капейкі. Газіроўчкі ў краме вып'еце...

Ад гэтых слоў студэнты языкі праглынулі, а бабуля — гнула сваё:

— Там жа, у краме, — казала, — у вас і бутэльку могуць прыняць. Таксама 12 капеек будзе. Сваіх дабавіце — купіце слоік гарошку...

У хату, дзе кватаравалі, хлопцы прыйшлі стомленыя, злыя, але ж віду не падалі.

— Ну, колькі зарабілі? — з зайздрасцю спыталі ў іх аднакурснікі (яны, дарэчы, таксама на калым да бабулі прасіліся).

— Тры рублі, — схлусілі хлопцы (бо не хваліцца ж тым, як іх абдурылі).

— Ну, дык тут грашавітыя людзі, добра плацяць, — прызнала грамада і, дзякуй богу, не паслала хлапцоў у краму па віно ці гарэлку...

Што цікава, мяняюцца як быццам часы ды стагоддзі, а падобныя бабулі сустракаюцца і цяпер. Вось хоць бы Ігнатаўна...

Сказаць, што яна — чалавек эканомны, значыць, прамаўчаць, бо над кожнай капейкай жанчына трэслася нават тады, калі працавала, а ўжо як на пенсію пайшла... Ды каб жа якая шматдзетная, каб сямёра ўнукаў па лаўках, каб ніякага запасу, а то ж...

Карацей, яна таксама дроў прыкупіла. З просьбай, каб парэзаў, пайшла да свайго вяскоўца Пятра. У таго бензапіла ёсць, а вось грошай, на жаль, заўжды не хапае, і такса ўсім вядомая: 35 рублёў... Ігнатаўна, праўда, адразу ўпрасіла, каб пяцёрачку скінуў.

Той згадзіўся, прыйшоў на падворак і палову тых дроў парэзаў — прысеў адпачыць. Гаспадыня тут як тут:

— Цяжкая, — кажа, — работа... Але ж і дорага ты бярэш... А ў мяне пенсіі — кот наплакаў! За дровы шмат аддала, за балон заплаціла, у аптэку зайшла, бо лекі скончыліся... Можна, я табе дваццаць пяткай заплачу? — клянчыла бабуля.

Пятро, каб не чуць гэтага ныцця, махнуў рукою ды зноў уключыў пілу.

Калі работа была завершана, гаспадыня прынесла... 20 рублёў. Болей, маўляў, нямашака.

Пільшчык плюнуў (бо што тут зробіш?) ды пайшоў са двара...

Што цікава, тыдні праз два ён, можна сказаць, вярнуўся: у суседзяў Ігнатаўны дровы парэзаў.

— Колькі ж яны заплацілі? — спытала бабуля ў Пятра.

— Ды — як людзі — 35 рублёў.

— Ну, і нядорага ж, — прызнала скупяндзя, а, падумаўшы, яшчэ і дадала, — зусім нядорага.

Ці ўспомніла пры гэтым, як разлічвалася сама, — таямніца, пакрытая цемрай.

Фаіна Касаткіна,

г. Паставы.

ПАМЫЛКА ГЕНЕРАЛА

СТРАЛЕЦ. Спрыяльны момант для змены свайго жыцця ў лепшы бок. Адчуеце прыліў свежых сіл і з новым запалам прыступіце да працы. Пажадана пакінуць у спакоі старыя праблемы і сканцэнтравацца на новых ідэях. Праявіўшы сабранасць і цярпенне, зможаце дабіцца значнага поспеху. Імкніцеся да самастойнасці ў справах і да свабоды ў творчасці. У суботу будуць удалымі паездкі і падарожжы ўсёй сям'ёй.

КАЗЯРОГ. Вы занадта напружаныя і паглынутыя думкай: а як там у іншых? Варта расслабіцца і проста добрасумленна выконваць сваю работу. Не стварайце для сябе лішніх праблем з-за сваёй гіперадказнасці і празмернага імкнення кантраляваць усё на свеце. Кожнаму не дапаможаш. Вас могуць выкарыстоўваць, а потым кінуць. Будзьце ўважлівыя ў фінансавых справах і пры стварэнні новых праектаў. Аддавайце больш увагі блізкім людзям.

ВАДАЛІЙ. У пачатку тыдня важна наладзіць паразуменне з навакольнымі людзьмі, і ў вашым жыцці з'явіцца больш камфорту і парадку. У аўторак вы здольныя набраць добры працоўны тэмп, паспрабуйце захаваць яго да канца тыдня. У чацвер не варта збіраць гасцей, паколькі гэта не прынясе нічога, акрамя клопатаў. У нядзелю, пры наяўнасці адпаведнага настрою, з'явіцца магчымасць заняцца сур'ёзнай даследчай дзейнасцю.

РЫБЫ. На гэтым тыдні навакольныя будуць прыслухоўвацца да вашага меркавання, не ўпусціце магчымасць паўплываць на сітуацыю, але не нагаварыце лішняга. У сераду выкарыстоўвайце толькі праверэныя метады, новаўвядзенні пачакаюць. Будзе нялішне прытрымлівацца парад старэйшых, не саромейцеся звяртацца да іх па дапамогу. У пятніцу важна захаваць у сакрэце свае і чужыя тайны.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.01	20.18	14.17
Віцебск —	5.47	20.11	14.24
Магілёў —	5.51	20.08	14.17
Гомель —	5.51	20.01	14.10
Гродна —	6.16	20.32	14.16
Брэст —	6.20	20.29	14.09

Месяц

Поўня ў 14.12.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Івана, Якава.*
К. *Эмы, Адольфа, Лявона.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

19 КРАСАВІКА

У краіне

1563 год — Пётр Мсціславец, беларускі першадрукар і гравёр, у Маскоўскай друкарні Івана Фёдарава пачаў друкаваць першую датаваную кнігу «Апостал» (на царкоўнаславянскай мове ў рускай рэдакцыі, захаваўся 61 экзэмпляр).

1912 год — нарадзіўся (г. Полацк) Леанід Прокша, беларускі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў і нарысаў «Крыніца прыгажосці», памфлетаў «Камедыянты», «След вядзе за мяжу», «Інтрыгі прэзідэнцкага двара», рамана «Пакуль жывеш на свеце», твораў для дзяцей. Памёр у 1994 годзе.

1919 год — у Вільні ўрадам Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел) у сувязі з нападам на рэспубліку польскіх войскаў і цяжкім ваенным становішчам быў створаны Савет абароны Літвы і Беларусі. З 28 красавіка 1919 года знаходзіўся ў Мінску. Сканцэнтраваў усю дзяржаўную і ваенную ўладу і дзейнічаў у кантакце з РВС Літоўска-Беларускай арміі (з чэрвеня 1919-га — 16-й арміі).

1927 год — заснаваны Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь, адзін з найстарэйшых калектываў былога Савецкага Саюза. Першае выступленне аркестра адбылося пад кіраўніцтвам расійскага кампазітара Р. Гліэра пры ўдзеле вядомага аўстрыйскага піяніста Р. Готліба. У 1937 годзе пачала сваю дзейнасць Беларуская дзяржаўная філармонія, і сімфанічны аркестр стаў асноўным калектывам, які ўвайшоў у яе склад. Яркімі радкамі ў гісторыю культурнага жыцця Беларусі ўпісаны выступленні аркестра з найвялікшымі салістамі XX стагоддзя — Д. Ойстрахам, С. Рыхтэрам, М. Растраповічам, Г. Вішнеўскай, В. Клібернам і многімі іншымі.

У свеце

1810 год — пачалася вайна за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы 1810—1826 гады.

1902 год — нарадзіўся Веніямін Каверын, рускі савецкі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў, раманаў «Бубновая масць», «Два капітаны», «Адкрытая кніга» і іншых. Памёр у 1989 годзе.

1918 — наркамат па ваенных справах прыняў эмблему Чырвонай Арміі — пяціканцовую зорку з залатой каймой (нагрудны знак асабовага складу).

1935 год — было арганізавана добраахвотнае фізкультурны таварыства «Спартак» — адна з найстарэйшых савецкіх фізкультурна-спартыўных арганізацый.

1949 год — Савет Міністраў СССР прыняў пастанову з даручэннем Міністэрству сувязі арганізаваць глушэнне радыёстанцый, якія вядуць антысавецкае вяшчанне на СССР.

УСМІХНЕМСЯ

— Вовачка, не бі хлопчыка лапатай па галаве, а то спацееш і застудзішся!

Каб заваяваць павагу старшакласнікаў, настаўніца зрабіла татуіроўку са шпаргалкамі па сваім прадмеце.

— Чаму ўсе мужчыны забываюць пра гадавіну вяселля, а жонкі памятаюць?

— І чаму?

— Вось уяві сабе. Ты злавіў калісьці вялікую, ну проста велізарную рыбу! Будзеш ты ўспамінаць пра гэта кожны год?

— Канешне.

— А рыба?..

Сям'я — гэта размаўляць з чалавекам, які сядзіць у прыбіральні.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1265.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 красавіка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

19 красавіка 2019 г. № 16 (501)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

НА СКРЫЖАВАННІ ШЛЯХОЎ І МАГЧЫМАСЦЯЎ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Брэстчына — самы заходні рэгіён краіны. Вобласць мяжуе з Еўрасюзам на захадзе і з Украінай на поўдні. І гэта яе становішча на скрыжаванні ажыўленых шляхоў з усходу на захад і з поўначы на ўсход, аказвае значны ўплыў на развіццё эканомікі, інфраструктуры, на менталітэт людзей. Варта сказаць, што рэгіён мае добры транспартны складнік. Брэсцкі чыгуначны вузел з'яўляецца адным з найбуйнейшых у Цэнтральнай Еўропе. Асаблівую важнасць мае і аўтадарожны транзітны калідор Берлін — Варшава — Брэст — Мінск — Масква.

Брэсцкі напрамак традыцыйна прывабліваe турыстаў і найперш знакамітым Нацыянальным паркам «Белавежская пушча». Гэты ўнікальны лес займае сваё пачэснае месца побач з сусветна вядомымі ляснымі запаведнікамі. Тысячы людзей едуць у нашу краіну, каб пабачыць Ружанскі і Косаўскі палацы, пабываць на малой радзіме Адама Міцкевіча, Напалеона Орды, Тадэвуша Касцюшкі. Але і ў кожным райцэнтры, аграгарадку, мястэчку знойдуцца асаблівыя памятныя мясціны, дарагія тутэйшым людзям і цікавыя неабыякаваму падарожніку.

Сталіцай Палесся нездарма называюць Пінск. Сёлета ён стаў яшчэ і культурнай сталіцай краіны. Гэта адзін са старэйшых і найпрыгажэйшых гарадоў вобласці. Адносна малады горад Баранавічы вядомы як індустрыяльны цэнтр, месца перадавых людзей і тэхналогій. Менавіта ў Баранавічах з'явіўся першы ў краіне орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея».

А тысячагадовы Брэст сёлета адзначае свой велічны юбілей. Горад прыгажэе на вачах, да гэтай прыгажосці прычыніліся тысячы людзей. Яны садзяць дрэвы, паляпшаюць свае вуліцы і дварэ. Брэст рыхтуецца сустрэць не толькі міленіум, але і 75-годдзе вызвалення. Брэсцкая крэпасць на многія гады стала сімвалам стойкасці і супраціўлення ды цікавым аб'ектам для вывучэння гісторыі вайны і гісторыі краіны.

Брэсцкая вобласць вядомая многімі аб'ектамі, славутасцямі, добрымі справамі. Але ж галоўнае — людзі з іх працавітасцю, ініцыятывай, жаданнем зрабіць свой край лепшым.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 3—16-й стар.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Форум гарадоў-пабратымаў



Спікер Савета Рэспублікі прапанаваў парламенцкай дэлегацыі Францыі разгледзець ідэю супрацоўніцтва ў такім фармаце. стар. 2

Як навесці парадак



Эксперты вывучылі стан спраў у гаспадарках трох раёнаў Брэстчыны. стар. 4

Дэпутацкая алея

З'явілася ў Драгічыне ў рамках тыдня лесу. стар. 4

Адзіны дзень занятасці

Пройдзе ў Беларусі 25 красавіка. Дзе ў Мінску чакаюць беспрацоўных? стар. 16

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

ЛАБАРАТОРЫЯ СОНЦА НА ФОНЕ СТАРОГА САДУ

Тут зроблена шмат па добраўпарадкаванні, ёсць нямала крэатыўных узораў ландшафнага дызайну. Мясцовыя жыхары кожны год прыдумваюць і ствараюць новыя клумбы, высаджваюць новую расліннасць, разводзяць новыя кветкі. Чаго не хапала ў Відамлі, што ў Камянецкім раёне, дык гэта хіба што Лабараторыі сонца. Вось і яна паявілася мінулым летам. Назва трошкі нават інтрыгуе. Але пра лабараторыю скажам крыху пазней. стар. 14

Як у Відамлі ствараюць і падтрымліваюць прыгажосць усёй грамадой

Старшыня Відамлянскага сельскага Савета Марына КАРАЛЮК.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Беспілотнікі і рэнтгенаўская тэхніка

Найбольш перспектыўныя сферы ў інавацыйным супрацоўніцтве Беларусі і Казахстана.

Краевугольным каменем для партнёрства дзвюх краін у сферы высокіх тэхналогій стала пагадненне аб стварэнні падкамісіі па развіцці супрацоўніцтва ў інавацыйнай сферы. Яно было падпісана ў лістападзе мінулага года. Да канца 2018-га ў Астане ўдалося рэалізаваць сумесны праект у гэтым кірунку. У сталіцы Казахстана адкрылася цяплічная гаспадарка з асвятленнем святлодыёднымі лямпамі, створанымі Цэнтрам святлодыёдных і оптаэлектронных тэхналогій Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Пра тое, што напярадзе шэраг яшчэ больш маштабных праектаў, гаварылі на гэтым тыдні ў Мінску падчас першага пасяджэння падкамісіі па развіцці супрацоўніцтва ў інавацыйнай сферы Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Сената парламента Казахстана.

«Зусім нядаўна мы адкрылі самую буйную ў рэгіёне цяпліцу для вырошчвання агародніны па беларускіх тэхналогіях. Наша святлодыёдная тэхніка гарантуе павышэнне ўраджайнасці тамацінаў у два разы. Прычым гэта не проста цяпліца, а высокатэхналагічны праект. Мы плануем яго пашыраць як у Казахстане, так і за яго межамі», — сказаў **Сяргей РАХМАНАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.**

Па словах сенатара, Беларусь уваходзіць у шэраг краін-лідараў па вытворчасці тэхнікі для догляду (сюды ўключана і тэхніка для догляду са штучным інтэлектам, і медыцынскія рэнтгенаўскія тамографы).

sovrep.gov.by

«Вось гэтыя рэчы мы збіраемся ствараць сумесна. І наша ідэя заключаецца ў тым, каб, працуючы разам з Казахстанам, адначасова працаваць па перыметры нашых краін, з трэцімі краінамі», — паведаміў Сяргей Рахманаў.

На думку казахстанскіх парламентарыяў, для Беларусі асаблівую значнасць маюць сумесныя праекты ў сферы перапрацоўкі нафты. А чым цікавая казахстанскім навукоўцам наша краіна, расказаў **Бакытжан ЖУМАГУЛАЎ, член Камітэта Сената парламента Рэспублікі Казахстан па сацыяльна-культурным развіцці і навуцы:** «Нас цікавяць у Беларусі новыя тэхналогіі па беспілотніках, ІТ-тэхналогіі. Па шматлікіх галінах эканомікі ёсць вельмі сур'ёзныя распрацоўкі і інавацыйныя праекты, якія маглі б працаваць на казахстанскую эканоміку. Мы ў гэтым вельмі зацікаўленыя. Што датычыцца нашага боку, мы таксама вельмі зацікаўленыя, каб распрацоўкі і новыя тэхналогіі, якія ў нас ёсць (асабліва ў кірунку навуковых даследаванняў), былі даступныя для беларускага боку».

Аб тым, што парламентарыі сур'ёзна настроены як мага хутчэй ад перагавораў падысці да рэалізацыі канкрэтных праектаў, сведчыў і склад удзельнікаў сустрэчы. На пасяджэнне з беларускага боку былі запрошаны прадстаўнікі Навукова-вытворчага цэнтра шматфункцыянальных беспілотных комплексаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Навукова-даследчага інстытута тэхнічнай аховы інфармацыі, супрацоўнікі прадпрыемства па вытворчасці оптаэлектронных прылад для вымярэння геаметрычных велічынь.

Па словах парламентарыяў, практычных вынікаў ад рэалізацыі новых праектаў можна чакаць ужо ў канцы бягучага года.

Марыя ДАДАЛКА.

Ад форуму гарадоў-пабраціmаў да ядзернай бяспекі

Сфера інтарэсаў парламенцкай дэлегацыі Францыі ў Беларусі была разнастайнай

На гэтым тыдні дэлегацыя групы дружбы «Францыя — Беларусь» Сената Францыі, якую ўзначальваў намеснік старшыні Камісіі па фінансах Шарль ГЕНЭ, наведала з афіцыйным візітам беларускую сталіцу, пабывала на некаторых аб'ектах Мінскай і Гродзенскай абласцей.

За парламенцкімі кантактамі актывізуецца і бізнес

Вітаючы гасцей на сустрэчы ў Савеце Рэспублікі, **спікер верхняй палаты беларускага парламента Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** з задавальненнем адзначыў актывізацыю ў апошнія гады беларуска-французскіх адносін:

— Гэта датычыцца палітычных кантактаў, міжпарламенцкага дыялогу, эканамічнага супрацоўніцтва, — падкрэсліў ён і выказаў упэўненасць, што ў межах візіту будзе магчымасць разгледзець разнастайныя цікавыя праекты, якія сёння гатовы прапанаваць беларускі бок.

— Гэта першы візіт на такім высокім узроўні, і я мяркую, што ён будзе паспяховым, — выказаў упэўненасць Міхаіл Мясніковіч.

На сустрэчы ён акцэнтаваў увагу на шматвектарнасці палітыкі, якую праводзіць Беларусь, і актывізацыі беларуска-французскіх адносін. Як вынік — рост тавараабароту паміж дзвюма краінамі. Так, леташні аб'ём узаемнага гандлю ў параўнанні з 2017-м вырас на 9 % і склаў 399 мільёнаў долараў. Беларускі экспарт у Францыю павялічыўся на 12,2 %, а французскі імпарт у Беларусь — на 8,3 %. Ужо сёлета пазітыўная дынаміка працягнулася, паказаўшы рост узаемнага гандлю амаль у 1,4 раза.

Адпаведны рост дэманструе і работа па прыцягненні французскіх інвестыцый у беларускую эканоміку. Летась было прыцягнута 8,1 мільёна долараў (172 % да ўзроўню папярэдняга года), з іх прамыя інвестыцыі — 7,7 мільёна. Дарэчы, у Беларусі зарэгістраваныя 63 арганізацыі з французскім капіталам. Найбуйнейшымі кампаніямі, якія працуюць у нашай краіне, з'яўляюцца Peugeot, Citroen, Renault, Danon і шэраг іншых.

— Гэта сведчыць аб тым, што і бізнес падцягваецца да таго ўзроўню палітычных кантактаў, якія ўсталёўваюцца паміж нашымі краінамі, — падкрэсліў спікер верхняй палаты беларускага парламента.

Узаемная падтрымка

Акрамя пытанняў двухбаковага парадку дня старшыня Савета Рэспублікі прапанаваў таксама абмеркаваць тэмы, звязаныя з узаемнай падтрымкай на міжнародных пляцоўках, у тым ліку і ў межах Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што Беларусь рыхтуе да летняй сесіі праект рэзалюцыі, прысвечанай развіццю навукі, тэхналогій і інавацый, і выказаў надзею, што французскія парламентарыі падтрымаюць беларускія ініцыятывы.

Асаблівая ўвага была нададзена і развіццю пабрацімскіх адносін і супрацоўніцтву паміж гарадамі і рэгіёнамі Беларусі і Францыі.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Мы ведаем, што вы на працягу шасці гадоў былі адным з кіраўнікоў Сената Францыі, узначальвалі асацыяцыю мэраў гарадоў, безумоўна, у вас вельмі багаты вопыт, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч, звяртаючыся да Шарля Генэ з прапановай падумаць аб такім фармаце ўзаемадзеяння, як форум гарадоў-пабрацімаў.

У сваю чаргу старшыня групы дружбы «Францыя-Беларусь» Францыі падзякаваў за цёплы прыём і заўважыў, што ва ўзаемаадносінах дзвюх краін ёсць некаторае адставанне, якое, у тым ліку дзякуючы групе дружбы, неабходна пераадолець.

— Мы тут дзеля таго, каб нарошчваць наша супрацоўніцтва як у культурнай сферы, так і ў эканамічнай галіне, — падкрэсліў ён.

Паводле яго слоў, за 18 месяцаў існавання адпаведнай групы ў французскім Сенаце з'явіўся шэраг напрацовак, якія маглі б пашырыць супрацоўніцтва па некалькіх кірунках. У прыватнасці ў лясной прамысловасці і ўсім, што з ёю звязана. Прывабнай, з пункту гледжання французскіх парламентарыяў, бачыцца і сфера турызму (так званы турыстычны інжынірынг). У фокусе ўвагі знаходзіцца і стварэнне найноўшых тэхналогій, штучнага інтэлекту, лічбавых тэхналогій.

Па выніках сустрэчы ў Савеце Рэспублікі Шарль Генэ расказаў, што бакі вызначылі шэраг напрамкаў, па якіх магло б развівацца двухбаковае эканамічнае супрацоўніцтва. У прыватнасці, адзін з прыярытэтных — развіццё ІТ-сферы. Таксама гаворка датычылася супрацоўніцтва па вырабе прадуктаў харчавання і ў галіне аўтамабілебудавання.

Акрамя таго, на сустрэчы бакі закранулі пытанне ядзернай энергетыкі:

— Паколькі Францыя валодае велізарным вопытам у гэтай сферы, мы абмеркавалі магчымасці абмену ім паміж спецыялістамі Беларусі і Францыі, у прыватнасці ў галіне бяспекі ядзернай энергетыкі, паколькі пытанне бяспекі хвалюе насельніцтва як вашай краіны, так і нашай, — падкрэсліў парламентарый.

Вучаць у школе, вучаць у школе...

Кіраўнік рабочай групы па супрацоўніцтве з Францыяй у Савеце Рэспублікі, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар СІРЭНКА ў гутарцы з журналістамі падкрэсліў значнасць першага візіту парламенцкай дэлегацыі. Ён акцэнтаваў увагу на двухбаковым супрацоўніцтве ў галіне нарматыўнай базы, адукацыйнай, навукова-тэхнічнай сферах, развіцці адносін, звязаных з ядзернай бяспекай і ўтылізацыяй ядзерных адходаў.

Паводле яго слоў, французскі бок хвалюе і праблема вывучэння французскай мовы ў Беларусі: з кожным годам зніжаецца колькасць дзяцей, якія вывучаюць яе ў школе.

— Мы гатовыя да дыялогу абсалютна па ўсіх напрамках, — адзначыў ён, падкрэсліўшы, што развіццё міжпарламенцкіх кантактаў паслужыць пазітыўным сігналам для бізнесу. — На сённяшні дзень пунктаў судакранання для паглыблення кантактаў досыць шмат, мы павінны іх убачыць, абмеркаваць і даць штуршок далейшаму развіццю супрацоўніцтва.

У рамках візіту парламенцкай дэлегацыі Францыі ў Беларусь адбыўся шэраг сустрэч з кіраўніцтвам Міністэрства замежных спраў, Канстытуцыйнага Суда, Парка высокіх тэхналогій. Парламентарыі Сената Францыі наведалі ААТ «БелАЗ», шэраг аб'ектаў Мінскай і Гродзенскай абласцей.

Вольга АНУФРЫЕВА.

❍ Наша даведка

Найвышэйшым прадстаўнічым і заканадаўчым органам Францыі з'яўляецца двухпалатны парламент. Ніжняя палата — Нацыянальны сход, дэпутаты якога абіраюцца тэрмінам на пяць гадоў на аснове ўсеагульнага і прамога галасавання, разглядаецца як орган агульнанацыянальнага прадстаўніцтва.

Сенат, члены якога абіраюцца тэрмінам на дзевяць гадоў шляхам ускосных выбараў, прадстаўляе інтарэсы тэрытарыяльных калектываў.

Палаты фактычна валодаюць аднолькавай кампетэнцыяй, адрозненні ў асноўным датычацца толькі заканадаўчага працэсу, а таксама сферы парламенцкага кантролю.

Рабочая група па супрацоўніцтве з Францыяй у Савеце Рэспублікі і група дружбы «Францыя — Беларусь» у Сенаце Францыі былі створаны ў 2018 годзе. Дзейнасць груп накіравана на пашырэнне супрацоўніцтва пабрацімскіх гарадоў Беларусі і Францыі, усталяванне прамых кантактаў паміж дзелавымі коламі, развіццё двухбаковых адносін у інвестыцыйнай, сельскагаспадарчай, экалагічнай і іншых сферах.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

НАКІРОЎВАЦЬ, ПАДТРЫМЛІВАЦЬ, РАЗВІВАЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ

Аб складніках самакіравання ў невялікай вёсцы, аграгарадку, гарадской вуліцы і мікрараёне

У МЯСЦОВЫХ Саветах Брэсцкай вобласці ажыццяўляюць дэпутацкую дзейнасць 2962 дэпутаты. З іх 57 абраны ў абласны Савет, 607 — у Саветы базавага ўзроўню і 2298 — у Саветы першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню, значыць, у сельскія і пасялковыя. Гэта людзі, за якіх прагаласавалі выбаршчыкі, людзі, — адказныя перад жыхарамі сваіх акруг за тое, як развіваюцца тэрыторыі, якія рашэнні выпрацоўваюць і прымаюць органы ўлады на месцах. Аб рабоце дэпутатаў, Саветаў і ініцыятывах, якія становяцца рэальнымі справамі, — наша размова са старшынёй Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрыем НАРКЕВІЧАМ.

— На апошніх выбарах дэпутацкі корпус Брэстчыны абнавіўся амаль на 46 працэнтаў, — пачаў гаворку Юрый Іосіфавіч. — Значыць, крыху больш за палову дэпутатаў маюць вопыт работы. Такія суадносіны дазволяць захаваць пераемнасць з самымі лепшымі напрацоўкамі ў справе ажыццяўлення мясцовага самакіравання. Яшчэ на першай сесіі мы з дэпутатамі абласнога Савета зноў зверылі нашы пазіцыі і вызначылі прыярытэты ў рабоце. У полі зроку мясцовай улады шмат пытанняў. Гэта садзейнічанне выкананню прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і выканне бюджэту, падтрымка стварэння новых вытворчасцяў і садзейнічанне занятасці насельніцтва, прыцягненне ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая выкарыстоўваецца неэфектыўна, добраўпарадкаванне, развіццё сацыяльнай інфраструктуры, работа з пажылымі, адзінокімі грамадзянамі, сацыяльна неабароненымі слаямі насельніцтва, прафілактыка правапарушэнняў і прапаганда здаровага ладу жыцця, развіццё асабістай дапаможнай гаспадаркі, арганізацыя закупу малака ў насельніцтва, знос пустых і старых дамоў, вываз смецця і прывядзенне ў парадак палігонаў ЦБА, спрыянне выкарыстанню турыстычнага патэнцыялу рэгіёна. І гэта далёка не поўны пералік пытанняў, тэм, праблем, якімі займаюцца мясцовыя Саветы. Летась мы распрацавалі крытэрыі ацэнкі эфектыўнасці работы старшынь Саветаў базавага ўзроўню. Вынікі падводзім кожны квартал.

— Часта бываю ў сельскіх Саветах і ведаю, што кіраўнікі сельвыканкамаў сваёй работай бачаць найперш навядзенне парадку на зямлі, добраўпарадкаванне, падтрыманне ў належным стане тэрыторый. Хоць гэта і не проста, асабліва пры сціплых бюджэтах мясцовых выканкамаў у глыбінцы, некаторыя працуюць даволі цікава, дабіваюцца, каб вёскі, аграгарадкі выглядалі прывабна.

— Так, парадак на зямлі — той кірунак работы, які заўсёды меў асаблівую актуальнасць. А цяпер, калі мы жывём пад знакам Года малой радзімы, гэтая тэма набывае асаблівае гучанне. Хочацца, каб кожны куток нашай вобласці выглядаў прывабна. І, галоўнае, што нам гэта пад сілу. Трэба праявіць ініцыятыву і жаданне, не баяцца працаваць. Думаю, многім варта было б павучыцца ў Клейнікаўскім сельсавеце Брэсцкага раёна. Гэта прыгарадны сельсавет, які суседнічае з гарадской рысай Брэста, ён яшчэ і памежны. Па тэрыторыі праходзіць дзесяць кіламетраў дзяржаўнай мяжы з Польшчай. На тэрыторыі размяшчаюцца памежная застава і пункт пропуску. Усё гэта абавязвае падтрымліваць парадак на ўзроўні і займацца добраўпарадкаваннем з прыцягненнем магчымых сіл і сродкаў. У Клейніках менавіта так і робяць.

Некалькі гадоў таму ў квартале новай жылой забудовы стварылі дзіцячую пляцоўку. Квартал гэты вырас прыкладна за кіламетр ад асноўных вуліц аграгарадка. Жыллё там узвялі маладыя сем'і, у тым ліку шматдзетныя. А каб трапіць на бліжнюю дзіцячую пляцоўку, маці з каляскай трэба было прайсці кіламетр, а то і болей. І старшыня сельскага Савета Алена Мельнік вынесла гэтае пытанне на сельскі сход.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Стварылі ініцыятыўную групу, сабралі грошы, за якія набылі будаўнічыя матэрыялы. Сельвыканкам купіў абсталяванне для пляцоўкі. А на расчыстку пляцоўкі, добраўпарадкаванне тэрыторыі выйшла большасць жыхароў квартала. І цяпер пляцоўкай карыстаюцца ўсе.

А вуліца Пагранічная ў Клейніках была адрасам, куды пастаянна прыходзілі адказы на скаргі жыхароў. Бо па названай вуліцы вясной і восенню было цяжка як прайсці, так і праехаць. І вось жыхары на адным з чарговых сходаў вырашылі, што прыйшоў час дзейнічаць, а не толькі пісаць скаргі. Сабралі грошы, купілі матэрыял для падсыпкі. Потым за справу ўзяліся дарожнікі, ДРБУ-138 правяло падсыпку і грэйдзіраванне 590 метраў дарогі, па якой цяпер камфортна хадзіць у любое надвор'е. І што цікава, жыхары Пагранічнай вуліцы да сваёй дарогі ставяцца надзвычай беражліва. Самі сочаць за тым, каб па дарозе не хадзілі цяжкагрузы. У адваротным выпадку інфармуюць кампетэнтныя службы. Калі толькі хто пачынае праводзіць спецыфічныя работы, адразу паступае званок у сельсавет: грамада Пагранічнай вуліцы цікавіцца, ці мае дазвол на капанне траншэі арганізацыя альбо прыватная асоба, што яго распачала. Калі ж дарожнікі праводзяць чарговую прафілактыку дарожнага пакрыцця, ім пакажуць нават на невялікія агрэхі. Адным словам, людзі адчулі сябе гаспадарамі і паводзяць сябе адпаведным чынам. І гэта вельмі добра.

Такім жа чынам, з прыцягненнем грамадскасці ўдалося вырашыць глабальную для Клейнікаў праблему — абсталяваць парковачную пляцоўку. Раней цэнтральная плошча аграгарадка не раз станавілася месцам канфліктаў. Справа ў тым, што тут знаходзяцца школа мастацтваў з актавай залай, а таксама цэнтр карэкцыйна-развівальных заняткаў і рэабілітацыі інвалідаў. Тут жа размешчаны канцавы прыпынак грамадскага транспарту. Здаралася, што бацькі, якія прыязджалі на канцэрт сваіх дзяцей у школу мастацтваў і тыя, хто прыводзіў сваіх родных у цэнтр інвалідаў, застаўлялі машынамі плошчу так, што рэйсавы аўтобус развярнуцца не мог. Тады адбываўся канфлікт з выклікам ДАІ і высвятленнем адносін.

Кіраўнік Клейнікаўскага сельвыканкама са сваім актывам сумелі прыцягнуць спонсараў, дзяржаўныя і прыватныя структуры, якія працуюць на тэрыторыі, да фінансавання важнага для аграгарадка аб'екта. А мясцовыя жыхары, сталыя і моладзь, выйшлі на суботнікі і дапамаглі добраўпарадкаваць новую парковачную пляцоўку. У вёсках названага сельсавета ўжо стала традыцыяй прыбіраць прыбярэжныя зоны рэк Лясная і Буг. І ўзначальваюць гэту работу дэпутаты сельскага Савета, старасты вёсак. Людзі выходзяць маленькімі групамі і прыводзяць у парадак той участак ракі, які пацярпеў ад «набегу» адпачывальнікаў. Выхоўваць аматараў адпачынку на прыродзе тут узяліся чысцінёй і прыгажосцю. І вынік не прымусіў сябе чакаць: калі тры-чатыры гады таму на сабранае смецце патрабавалася два прычэпы трактара, то цяпер удаецца абысціся 8—10 мяхамі.

— Пагаджуся, гэты прыклад вельмі паказальны, калі сельская ўлада ўмела накіроўвае ды ўзначальвае ініцыятыву грамадзян. Але ж адна справа — вялікі аграгарадок побач з абласным цэнтрам, дзе людзей многа, іх матэрыяльнае становішча не горшае, ды на тэрыторыі працуюць паспяховыя прадпрыемствы, і зусім іншыя магчымасці для ажыццяўлення самакіравання ў невялікай вёсцы ў глыбінцы, дзе засталіся ледзь не адны пенсіянеры...

— Так, гэта іншыя магчымасці. Але і там ёсць добрыя прыклады сумеснай работы на карысць насельніцтва. Вёска Чамялы Волькаўскага сельсавета Івацэвіцкага раёна зусім не аграгарадок, там пражывае крыху больш за сто чалавек. З усіх сацыяльна-бытавых аб'ектаў працуе толькі магазін райспажыўсаюза. Дык вось самі жыхары абсталявалі Дом сацыяльных паслуг. Пры гэтым, заўважце, памяшканне прыстасавана не з былога клуба, КБА, закрытай школы, як звычайна бывае, а з прыватнага жылога дома. Больш за тое, у дома ёсць законны гаспадар, які пражывае ў райцэнтры. Дык вось староста вёскі Ганна Емельяновіч знайшла паразуменне з гаспадыняй. Гэтая жанчына выросла ў згаданым доме, цяпер яна пенсіянерка, пасля смерці бацькоў не мае магчымасці яго даглядаць, але і прадаваць не вельмі хоча. Таму яна і згадзілася даць сваю маёмасць ў карыстанне вясковай грамадзе ўзамен на падтрыманне парадку.

Цяпер тут праводзяцца сельскія сходы, прымае пацыентаў раз на месяц участковы тэрапеўт з Даманаўскай амбулаторыі, сюды зазіраюць участковы і інспектар пажарнага нагляду падчас прафілактычных мерапрыемстваў. Нават святар здзяйсняе споведзь для састарэлых людзей ды праводзіць асвячэнні. А вяскоўцы на чале са старастам прыбіраюць у доме і на двары, праводзяць касметычны рамонт памяшкання. Той выпадак, калі ініцыятыву грамадзян трэба ўсяляк падтрымліваць, накіроўваць, як і зрабіў старшыня сельвыканкама Ігар Карповіч.

— У гісторыі вясковага Дома сацыяльных паслуг ключавую ролю сыграла староста вёскі, якая, трэба разумець, чалавек актыўнай жыццёвай пазіцыі. І такія ёсць у кожным раёне. Людзі займаюцца гэтай работай на грамадскіх пачатках, многія даволі паспяхова. І ў сённяшнім выпуску расказваецца пра адну з такіх старастаў. Староста вёскі Яглевічы Валянціна Якімовіч на сваёй грамадскай працы кожны дзень. Ці дзейсная, на ваш погляд, сістэма заахвочвання старастаў, якая цяпер існуе?

— Штогод праводзім конкурсы-агляды работы старастаў як у вобласці, так і ў раёнах, пераможцы атрымліваюць грашовыя прэміі, падарункі. Згаданая вамі староста летась па выніках папярэдняга года станавілася пераможцай абласнога конкурсу. Ёсць свая сістэма заахвочвання ў кожным раёне. Раённыя Саветы адзначаюць найлепшых старастаў каштоўнымі падарункамі, граматамі, расказваюць пра іх у раённых сродках масавай інфармацыі.

Варта сказаць, у многіх сельсаветах ёсць старасты, якія працуюць цікава, нават творча. Гэтае азначэнне можна прымяніць, напрыклад, да старасты вёскі Залуззе Жабінкаўскага раёна Аляксандра Казака. Ён і суботнік арганізуе, і сам, калі трэба, дапаможа пажылому чалавеку. Адзінокай пенсіянеркі Надзеі Яшчук адрамантаваў печ. Староста з Малькавіч Ганцавіцкага раёна Мікалай Хілюціч галоўны ўхіл робіць на парадак. Разам з аднавяскоўцамі Мікалай Мікалаевіч вывозіць смецце з усталяваных на могілках кантэйнераў, канталюе стан міні-палігона для адходаў, абкошвае тэрыторыю. Ён праводзіць тлумачальную работу пра карысць раздзельнага збору адходаў і сам паказвае прыклад. Староста вёскі Вялікія Круговічы гэтага ж раёна Ванда Чабатарэнка вядзе вялікую работу па прафілактыцы п'янства і алкагалізму, эфектыўна працуе з праблемнымі сем'ямі. Яе сусед Іван Муха за свае сродкі абнавіў помнік загінулым воінам у вёсцы Кукава. Староста вёскі Хатынічы Андрэй Ярашэвіч стварае летапіс сваёй вёскі. Хоць, улічваючы працоўныя і грамадскія заслугі былога сельскага настаўніка, можна складаць летапіс пра яго самога.

Многія пытанні вырашаюць мясцовыя дэпутаты. Можна сказаць, што у выніку ажыццяўлення дэпутацкіх ініцыятыў вырашаны канкрэтныя праблемы добраўпарадкавання ў населеных пунктах, транспартнага абслугоўвання. Дэпутата Пінскага раённага Савета па Лагішынскай акрузе Андрэя Ціханава выбаршчыкі прасілі дапамагчы з арганізацыяй дадатковага рэйса з Лагішына ў Пінск. Па дэпутацкім запыце такі рэйс раніцай быў уведзены. Гэта вельмі актуальна, бо апошнім часам многія жыхары пасёлка дабіраюцца на работу ў горад. А, скажам, у Пінкавічах раней не было цывілізаваных умоў для гандлю сельгаспрадукцыяй. Дэпутаты сельскага Савета Дзмітрый Кісель і Аляксандр Вайтовіч, адзін з якіх намеснік дырэктара прадпрыемства, другі — начальнік участка ЖКГ, арганізавалі выбаршчыкаў на працоўную акцыю. Была праведзена работа па добраўпарадкаванні будучага мінірынку. Цяпер у сезон камфортна сябе адчуваюць як прадаўцы, так і пакупнікі.

— Наколькі я ведаю, ёсць цікавы вопыт вырашэння праблемы сезоннага гандлю ў Баранавічах...

— І заслуга гэта Савета дэпутатаў бягучага склікання. Прэзідыум гарадскога Савета вясной летась прыняў рашэнне аб упарадкаванні стыхійнага вулічнага гандлю. Замест таго, каб забараняць вулічны продаж агародніны, ягад, фруктаў, у горадзе акультурылі гандлёвыя месцы. З прыцягненнем рэкламнага прадпрыемства вырабілі навесы-павільёны, дзе сядзяць у асноўным пенсіянеры і прадаюць вырашчанае на лецішчы і прысядзібных участках. Канструкцыі паставілі там, дзе людзі гадамі альбо нават дзесяцігоддзямі прадавалі прадукцыю з агародаў і садоў. Такім чынам з'явілася 58 гандлёвых месцаў. І гэта стала своеасаблівым сацыяльным праектам для пенсіянераў, якія атрымліваюць прыбаўку да пенсіі, і дадатковай зручнасцю для гараджан.

Баранавічы наогул знакамітыя многімі ініцыятывамі ў галіне самакіравання. Адна з іх — першы ў краіне камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея». Добрая справа ва Усходнім мікрараёне Баранавіч, дакладней, па вуліцы Паркавай, пачалася ў 2003-м. Так што летась камітэт адзначаў сваё 15-годдзе. Былі аб'яднаныя намаганні жыльцоў 15 кааператыўных дамоў па вуліцы Паркавай па добраўпарадкаванні і падтрыманні парадку на прыдамавых тэрыторыях. Гаворка ішла тады пра тры тысячы жыхароў. Людзі адарваліся ад канап, выйшлі ў двары і многае зрабілі сваімі рукамі. Калі ж агульная справа атрымала арганізацыйнае ўвасабленне, з'явілася магчымасць атрымліваць гранты, у тым ліку замежныя. За еўрапейскія грошы, сродкі, выдзеленыя з бюджэту і сабраныя грамадзянамі карэнным чынам палепшылі асвятленне, азелянілімікрараён, абсталявалі дзіцячыя пляцоўкі. Зараз камітэт аб'ядноўвае 25 дамоў з колькасцю насельніцтва каля пяці тысяч чалавек. Адзін з апошніх праектаў «Надзеі» — падтрымка маламаёмасных катэгорый насельніцтва, шэфства над пенсіянерамі ў арганізацыі іх вольнага часу.

Эфектыўна працуе вулічны камітэт у Століне па вуліцы Дзяржынскага, у склад якога ўваходзіць дзевяць чалавек. За дзесяць гадоў работы камітэта памяняўся знешні выгляд прыдамавых тэрыторый. Шмат робіцца дэпутатамі абласнога цэнтра напярэдадні святкавання 1000-гадовага юбілею горада.

Гэты вопыт надзвычай каштоўны. Яго трэба выкарыстоўваць паўсюль у гарадах. Дамавыя камітэты, калі знайсці актыўнага лідара, могуць шмат зрабіць для навядзення парадку. А гэта і ёсць першасныя формы самакіравання. У падобных стасунках людзі знаёмяцца, пачынаюць камунікаваць, у найлепшых выпадках такая работа не абмяжоўваецца ўсталяваннем, напрыклад, адной дзіцячай пляцоўкі, а ідзе далей, развіваецца. І вось з такіх нефармальных лідараў дамоў, вуліц, кварталаў павінны вырастаць дэпутаты гарадскіх ці раённых Саветаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

(Бес)парадак, сяўба і занятасць

Эксперты вывучылі стан спраў у гаспадарках трох раёнаў Брэстчыны

РАБОТНІКІ Сакратарыята Савета Рэспублікі і прадстаўнікі НАН Беларусі правялі маніторынг у асобных сельгасарганізацыях рэгіёна, паведамілі ў Савеце Рэспублікі.

Па даручэнні спікера верхняй палаты парламента, упаўнаважанага прадстаўніка кіраўніка дзяржавы ў Брэсцкай вобласці Міхаіла Мясніковіча для маніторынгу сітуацыі ў сельскагаспадарчых арганізацыях былі створаны тры рабочыя групы, у якія ўвайшлі работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі і арганізацый Аддзялення аграрных навук НАН Беларусі.

Маніторынг правялі дзеля садзейнічання ў больш эфектыўнай ліквідацыі недахопаў.

На мінулым тыдні спецыялісты пабывалі ў гаспадарках Ганцавіцкага, Драгічынскага і Маларыцкага раёнаў, дзе вывучылі стан жывёлагадоўчых аб'ектаў, механізаваных двароў, ход вясенне-палявых работ, фінансавае становішча і іншыя пытанні. Вынікам такіх візітаў сталі адпаведныя прапановы.

У фокусе ўвагі экспертаў у першую чаргу былі пытанні падтрымання парадку ў сельскагаспадарчых арганізацыях, захавання тэхналогій пры правядзенні сяўбы. У прыватнасці, было выяўлена, што даручэнні кіраўніка дзяржавы па навядзенні парадку, добраўпарадкаванні аб'ектаў вытворчай інфраструктуры, асабліва ў арганізацыях з няўстойлівым фінансавым становішчам, выконваюцца не ў поўнай меры. На некаторых жывёлагадоўчых фермах элементарна не былі пабелены памяшканні, умовы ўтрымання жывёл не адпавядалі асноўным патрабаванням. Не было і сістэмнасці ў закупцы нарыхтоўшчыкамі другасных металаў, у выніку чаго на тэрыторыях мехдвароў назапашваецца лом.

Каб уладкаваць вытворчыя і дапаможныя аб'екты і прывесці іх у належны стан, прапанавана вызначыць канкрэтныя тэрміны, на мясцовым узроўні адшукаць крыніцы фінансавання, прыцягнуць дэпутацкі корпус.

Установлена, што работа па ўключэнні ў гаспадарчы абарот невыкарыстоўваемай і неэфектыўна выкарыстоўваемай маёмасці гаспадарак, якія знаходзяцца ў працэдуры фінансавага аздараўлення, мясцовымі органамі дзяржаўнага кіравання, антыкрызіснымі кіраўнікамі праводзіцца неналежным чынам ці не вядзецца зусім. Эксперты звярнулі ўвагу: вырашыць гэтую праблему магчыма з удзелам Дзяржкаммаёмасці, Мінэканомікі і іншых зацікаўленых бакоў.

Таксама адзначана, што, нягледзячы на створаныя ў краіне прававыя інструменты для фінансавага аздараўлення неплацежаздольных гаспадарак, гэтая работа вядзецца не на належным узроўні. Колькасць такіх арганізацый у вывучаных раёнах застаецца практычна нязменнай, а іх пратэрмінаваная запазычанасць расце.

Якое выйсце? Для павышэння эфектыўнасці сістэмы кіравання ў сельскагаспадарчых арганізацыях камунальнай формы ўласнасці і акцыянерных таварыствах з дамінуючай доляй камунальнай уласнасці ў Ганцавіцкім, Драгічынскім і Маларыцкім раёнах прапанавана ўкараніць элементы карпаратыўнага кіравання або адчужэння (напрыклад, продажу, бязвыплатнай перадачы) дзяржаўнага пакета акцый (маёмасці) фінансаваняўстойлівых арганізацый патэнцыйным інвестарам і эфектыўна працуючым суб'ектам гаспадарання.

Што датычыцца правядзення вясенне-палявых работ, у цэлым яны праходзяць ва ўстаноўленыя тэрміны, але гаспадаркі гэтых раёнаў адчуваюць дэфіцыт мінеральных угнаенняў. Каб вырашыць праблему, трэба адшукаць дадатковыя крыніцы фінансавання.

Важная роля ў Ганцавіцкім, Драгічынскім і Маларыцкім раёнах належыць забеспячэнню занятасці вяскоўцаў і павышэнню іх даходаў за кошт развіцця асабістых дапаможных гаспадарак і несельскагаспадарчай дзейнасці. Як канстатавалі ўдзельнікі рабочых груп, узровень абслугоўвання і задавальнення патрэб прыватных падворкаў у неабходных таварах, работах і паслугах застаецца нізкім, узнікаюць праблемы са збытам атрыманай прадукцыі.

На думку экспертаў, вырашыць гэтыя цяжкасці дапаможа адраджэнне і развіццё на першасным узроўні розных сельгаскааператываў. Пры гэтым важна ўлічваць вопыт работы такіх арганізацый у краіне і за яе межамі.

Інфармацыю аб выяўленых недахопах у рабоце сельскагаспадарчых арганізацый накіравалі ў Брэсцкі аблвыканкам для іх пераадолення ва ўзаемадзеянні з профільнымі рэспубліканскімі органамі кіравання і арганізацыямі.

Грамадская ініцыятыва як рухавік

Сенатар пра работу над законамі, сельскі бізнес, развіццё дапаможнай гаспадаркі, добраўпарадкаванне талакой

ЧЛЕН пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Віктар АМБРАЖЭЙЧЫК абраны ў верхнюю палату парламента ад Брэсцкай вобласці. Працуе Віктар Георгіевіч дырэктарам Драгічынскага лясгаса. На працягу некалькіх скліканняў быў дэпутатам Брэсцкага абласнога і Драгічынскага раённага Саветаў, значыць, мае практычны вопыт работы ў органах мясцовага самакіравання. Гутарку з ім пачынаем з прамых абавязкаў сенатара — работы над законамі.

— Што датычыцца законатворчасці, мне, як работніку лясной галіны, апошнім часам найбольш блізкай была работа над законам аб асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторыях, унясенні змяненняў у Лясны кодэкс, — гаворыць Віктар Амбражэйчык. — Названы закон быў прыняты ў 1994 годзе, за чвэрць стагоддзя шмат змянілася, той выпадак, калі само жыццё запатрабавала новую рэдакцыю важнага для краіны заканадаўчага акта. А вось Лясны кодэкс — намнога больш позні дакумент, яго змены абумоўлены практыкай вядзення лясной гаспадаркі і новымі прыроднымі з'явамі, што ўплываюць на стан лесу. Так што змяненні ў дакумент сталі своечасовымі і патрэбнымі.

— Што складае аснову вашай работы на месцы, у акрузе? З чым прыходзяць людзі да сенатара?

— На месцы члены Савета Рэспублікі працуюць у цеснай звязцы з мясцовымі Саветамі і дэпутатамі ўсіх узроўняў. На прыёмы людзі прыходзяць з самымі рознымі пытаннямі. Нядаўна грамадзяне прасілі знесці старое дрэва ў райцэнтры, адраманціваць участак дарогі. Традыцыйна пэўная частка зваротаў датычыцца работы ЖКГ. Разам з зацікаўленымі ведамствамі, як правіла, знаходзім рашэнне па гэтых пытаннях. Варта адзначыць, што ўсім дэпутатам паступаюць падобныя звароты, і яны носяць, калі не зусім прыватны, то дакладна, не глабальны характар. Найбольш хвалююць звароты, звязаныя з працаўладкаваннем, пошукамі работы, асабліва маладымі людзьмі. У Драгічынскім раёне апошнім часам з-за складанай фінансавай сітуацыі і з іншых прычын шэраг прадпрыемстваў значна скарацілі свой штат. Людзі вымушаны былі шукаць работу альбо спосаб карміць сябе і сваю сям'ю. На прыёмах, у размове на сесіях, на пасяджэннях выканкамаў мы прыходзім да высновы, што для эканомікі, альбо, як цяпер прынята гаварыць, для ўстойлівага развіцця тэрыторыі патрэбна больш прыватнай ініцыятывы. А мясцовая ўлада павінна ўсяляк гэтаму спрыяць.

Прыклады ёсць. Скажам, не так даўно ў вёсцы Літоўск адкрылася прадпрыемства «Літоўск Прам». Мясцовы жыхар Аляксандр Галабурда наладзіў свой невялікі бізнес. Аляксандр, заўважу, не заезджы інвестар, нават не прадпрымальнік са стажам. Ён жыхар суседняга Закозеля, а нарадзіўся і вырас у Літоўску. У 2014 годзе Аляксандр Аляксандравіч купіў будынак былой рамонтнай майстэрні і адкрыў у ім піларараму. Цяперашні вясковы бізнесмен да нядаўняга часу працаваў у мясцовай гаспадарцы механізатарам, кіроўцам, на іншых участках. А калі у вёсцы стала вядома, што памяшканне вызвалілася, на яго шукаюць пакупнікоў, яны з жонкай-бухгалтарам усё пралічылі, склалі свой бізнес-план і вырашылі рызыкнуць.

Найперш набылі тэхніку, абсталяванне, афармілі дакументы на распрацоўку лясной дзялянкі. Прадпрыемства займаецца распілоўкай дзелавой драўніны і атрымлівае будаўнічы матэрыял. Работу адразу пасля рэгістрацыі «Літоўск Прам» атрымалі сем чалавек. Але піларараму сваю Аляксандр Галабурда мае намер пашыраць, на падыходзе новы цэх з усім абсталяваннем. Такі прыклад, на шчасце, не адзінкавы, але нельга сказаць, што рэгістрацыя невялікага бізнесу стала масавай з'явай. У Драгічынскім раёне развіццё атрымала занятасць у прыватнай дапаможнай гаспадарцы.

Людзі бяруць участкі зямлі, займаюцца вырошчваннем маліны, клубніц. Драгічынскія маліннікі ведаюць цяпер далёка за межамі раёна, вобласці, нават краіны. І вось гэтае захапленне гаспадаркай дапамагло вырашыць даўнюю праблему, якой быў знос старых дамоў. Зараз гаспадары, якія жадаюць вырошчваць агародніну альбо ягады, купляюць ці бяруць у арэнду ўчасткі з нічыйнымі дамамі, зносяць рэшткі пабудоў, расчышчаюць тэрыторыю, распрацоўваюць зямлю і вырошчваюць сельгаскультуры. Гэта вельмі станоўчая тэндэнцыя. Магчыма, з такіх вось дробных гаспадароў у будучым вырастуць буйныя фермеры-прадпрымальнікі, а нехта з іх стане інвестарам будучага завода па перапрацоўцы ягад. Цяпер у многіх, калі не ва ўсіх, дробных гаспадароў узнікаюць праблемы са збытам сваёй прадукцыі, асабліва малін, якія вельмі хутка псуюцца. Адзін фермер выказаў намер узяцца за ажыццяўленне праекта перапрацоўчага прадпрыемства, але пакуль што названы праект не набыў рэальныя абрысы. Спадзяёмся, што з часам такое прадпрыемства з'явіцца.

Апошнім часам раённы Савет дэпутатаў стараецца накіроўваць фермераў, гаспадароў смялей асвойваць новыя віды прадукцыі. Напрыклад, можна вырошчваць кавуны альбо раянаваныя сарты вінограду. Клімат змяніўся, у нашых шыротах традыцыйна паўднёвыя культуры таксама могуць расці. І мы, дэпутаты абедзвюх палат парламента, падтрымліваем мясцовых дэпутатаў. Чым больш будзе прыватнай ініцыятывы, тым лепш будзе развівацца раён.

— А прыватная ініцыятыва суполак на чале са старастам альбо асобных груп людзей у вёсцы, сельсавеце, на ваш погляд, можа змяніць сітуацыю з добраўпарадкаваннем, паляпшэннем знешняга выгляду населеных пунктаў?

— Спакон веку ў нашых мясцінах многае рабілі талакой. І цяпер традыцыі папярэднікаў часам успамінаюць. У нашым раёне фактычна ў кожным сельсавеце можна знайсці такія ініцыятывы. Вось, скажам, у Імянінскім сельсавеце прыклад адной вёскі стаў штуршком для іншых. Спачатку знайшлася група ініцыятыўных людзей у вёсцы Дзераўная. Яны сабралі грошы, замянілі агароджу вакол могілак, потым узяліся за добраўпарадкаванне гэтай тэрыторыі ў цэлым. На іх погляд-дзелі суседзі з Зёлава, зрабілі тое ж самае. А цяпер жыхары аграгарадка Імянін выбралі ініцыятыўную групу па зборы сродкаў. Яны не хочуць адстаць ад іншых, а маюць намер зрабіць яшчэ лепш. Могілкі спрадвеку шанаваліся продкамі. І не дзіва, што навядзенне парадку ў вёсках пачынаюць з гэтага аб'екта. У вобласці ж можна прывесці мноства прыкладаў, калі людзі аб'ядноўваюцца ў вулічныя, дамавыя камітэты, а то і цэлым мікрараёнам вырашаюць пытанні добраўпарадкавання. Так робяць у камітэце тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея» ў Баранавічах. Можна згадаць, як збіраюцца людзі і разам уладкоўваюць дзіцячыя пляцоўкі, месцы агульнага адпачынку, разбіваюць футбольнае поле. Агульная справа не толькі яднае людзей, яна здольная мяняць светапогляд, стаўленне да сябе, суседзяў, да агульнай маёмасці. Тое, што зроблена агульнымі намаганнямі, зберагаецца таксама грамадой.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Дэпутацкая алея

У рамках тыдня лесу народныя абраннікі ўсіх узроўняў у Драгічыне высадзілі алею маладых дрэў.

На працоўную акцыю прыйшлі дэпутаты раённага Савета на чале са старшынёй Святланай Барташ. Калег падтрымалі члены абласнога Савета, парламентарыі. Па вуліцы Шаўчэнкі ў райцэнтры ўзнялася алея з елак, каштанаў, клёнаў.

Член Савета Рэспублікі Віктар АМБРАЖЭЙЧЫК і старшыня райсавета Святлана БАРТАШ.

Тэлесеткі

НА МОВЕ РАЗУМЕННЯ

У Белтэлерадыёкампаніі падтрымалі сацыяльны праект Беларускага таварыства глухіх. Сем чалавек з поўнай адсутнасцю слыху — удзельнікі каманды Deaf Sport Belarus, якія хочуць расказваць пра спартыўнае жыццё нашай краіны, — прайшлі стажыроўку ў медыяхолдынгу і паспрабавалі сябе ў якасці журналістаў, аператараў і рэжысёраў.

Цягам трох тыдняў інклюзіўнай стажыроўкі каманда Deaf Sport Belarus, у складзе якой ёсць 15-гадовая школьніца, шматдзетная маці, касір так званых ціхіх кас буйной сеткі супермаркетаў, спартсмен-інструктар па лёгкай атлетыцы, прайшла шматфункцыянальнае навучанне і атрымала мноства карысных парад і падказак ад тэлевізійных спецыялістаў.

Многа зроблена ў плане добраўпарадкавання народнымі выбраннікамі ў акругах. Планам мы прадугледзелі ў кожнай акрузе ўладкаваць не менш за дзве дзіцячыя пляцоўкі, палепшыць дваровыя тэрыторыі. Прамежкавыя вынікі падводзім на пасяджэннях дэпутацкіх камісій, пастаянна трымаем пытанні на кантролі прэзідыумам Савета. З такім жа парадкам дня прайшоў прэзідыум і на гэтым тыдні. Зараз дэпутаты асаблівую ўвагу ўдзяляюць санітарнаму стану і добраўпарадкаванню прыватнага сектара. Як правіла, там узнікае найбольш пытанняў.

> Амаль за кожным радком праграмы стаіць удзел некага з нашых дэпутатаў. Думаю, што будзе зроблена ўсё магчымае, каб Брэст, які першы з гарадоў Беларусі атрымаў самакіраванне на аснове Магдэбургскага права ў 1390 годзе, прыгожа і годна адзначыў сваё 1000-годдзе.

Старшыня гарадскога Савета лічыць асабліва важнай на цяперашнім этапе прапагандысцкую і тлумачальную работу з насельніцтвам кожнай акругі. Трэба, каб людзі адчулі сваю зацікаўленасць, уласны абавязак зрабіць нешта карыснае для паляпшэння дваровай тэрыторыі, свайго ўчастка, калі гаворка ідзе аб прыватным домаўладанні. Тады горад стане крышачку прыгажэйшы, і тады мы адчуем, што гэта наша агульнае свята.

— Нездарма свой дэпутацкі план мы аб'ядналі з маладзёжным, — працягвае Мікалай Васілевіч. — Можна сказаць, што ўсе сродкі і намаганні, якія ўкладваюцца ў правядзенне юбілею, — гэта работа для будучага камфортнага пражывання новага пакалення брастаўчан. І Заходні абход, і новыя масты, дарогі, і прыгожыя будынкі, якія ўзводзяцца па праграме святкавання, застануцца гораду на многія гады. Трэба, каб маладыя гэта бачылі, правільна ацанілі, і што самае важнае, прадоўжылі работу па развіцці, паляпшэнні, удасканаленні горада ў другім тысячагоддзі. Таму ў праграме юбілею пазначана шмат культурных, гістарычных, асветніцкіх мерапрыемстваў. Конкурсы, фестывалі, навуковыя канферэнцыі, музычныя форумы праводзяцца для таго, каб зрабіць гэты юбілейны год знамянальным і запамінальным. Не перабольшу, калі скажу, што амаль за кожным радком праграмы стаіць удзел некага з нашых дэпутатаў. Думаю, што будзе зроблена ўсё магчымае, каб Брэст, які першы з гарадоў Беларусі атрымаў самакіраванне на аснове Магдэбургскага права ў 1390 годзе, прыгожа і годна адзначыў сваё 1000-годдзе.

ДЭПУТАТ У АКРУЗЕ

КАРАБЕЛЬ СА СЦЭНАЙ

Як рэалізацыя адной мясцовай ініцыятывы стварыла трамплін для другой

ЧАСАМ даводзіцца чуць скептычнае: маўляў, што можа дэпутат сельскага Савета? А вось у Батчынскім сельскім Савеце, што ў Кобрынскім раёне Брэстчыны, раскажуць, што можа, аказваецца, нямала. Як, напрыклад, дэпутат гэтага Савета Ала САПЯЖЫНСКАЯ: яна выступіла з ініцыятывай, знайшла аднадумцаў, аформіла дакументы на грант — стала генератарам ідэі. Атрыманыя грошы сталі штуршком для развіцця самакіравання. Людзі зразумелі, што яны могуць зрабіць многае для паляпшэння якасці жыцця. І здзейснілі гэта. Важна таксама, што рэалізацыя адной ініцыятывы стварыла трамплін для другой.

Але аб усім па парадку. **Старшыня сельскага Савета Святлана ГАНГАЛА** расказала, што на адным са сходаў пасёлка Птушкафабрыка гаворка зайшла пра абсталяванне дзіцячай пляцоўкі. Сельвыканкам паабяцаў паставіць дзве лаўкі ды зрабіць пясочніцу, бо на большае ў мясцовага органа ўлады сродкаў не было. Тады слова ўзяла Ала Сапяжынская, расказала пра кобрынскі клуб дзелавых жанчын «Бона» і прапанавала праз гэтую грамадскую арганізацыю падаць заяўку на грант.

Фота аўтара.

Разам з паплечніцамі Ала Сяргееўна напісала сваё бачанне мясцовай ініцыятывы ў рамках праекта Tandem-III «Супрацоўніцтва для развіцця мясцовых таварыстваў і ўдзелу грамадзян у мясцовым самакіраванні» пры падтрымцы Еўрапейскай асацыяцыі мясцовай дэмакратыі (ALDA) і асветніцкага грамадскага аб'яднання «Фонд імя Льва Сапегі». Цяпер аб гэтым нават расказвае невялічкая шыльда.

Выйгралі грант, атрымалі каля чатырох з паловай тысяч еўра. За гэтыя сродкі купілі арэлі, каруселі, маленькі батут, некалькі лавак. Спачатку думалі проста абсталяваць дзіцячую пляцоўку, на большае не замахваліся. Работу ўзначаліла **староста пасёлка Таццяна КАМІНСКАЯ**. На будаўніцтва сабраліся самыя актыўныя бацькі сямействаў. Многія прыйшлі цэлымі сем'ямі. Мужчыны ставілі і муравалі элементы канструкцый, жанчыны і дзеці фарбавалі, упрыгожвалі. Агароджу яшчэ не паставілі, як прыйшло разуменне, што пляцоўка мусіць быць большай: тут патрэбна больш прыстасаванняў для актыўнага адпачынку дзяцей. Некаторыя энергічныя бацькі знайшлі будаўнічы матэрыял, было зроблена яшчэ некалькі лавак. Падключыліся іншыя дэпутаты сельскага Савета, кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў. А потым ідэі сталі множыцца, нешта знаходзілі ў інтэрнэце, падглядалі ў горадзе. Умельцы выраблялі сваімі рукамі малыя архітэктурныя формы, паступова з'яўляліся драўляныя грыбкі, фігуры жывёл. Нехта прынёс бабулін куфар, але не для ўпрыгажэння: туды складвалі ўвесь дзіцячы пясочны інвентар — вёдры, граблі, лапаты, каб не насіць кожны раз з дому. Для дарослых абсталявалі побач валейбольную пляцоўку, потым поле для міні-футбола, далей — поле для вялікага футбола. Знайшлі спонсара і паставілі турнікі ды брусы для гімнастыкі.

На ўрачыстае адкрыццё пляцоўкі сабраўся ледзь не ўвесь пасёлак з крыху дзіўнай назвай Птушкафабрыка. Людзі не толькі віншавалі адно аднаго з добрай падзеяй у жыцці населенага пункта, яны зноў дзяліліся ідэямі. **Адзін з актыўных удзельнікаў будаўніцтва пляцоўкі Вадзім ГЛАВАЦКІ** прапанаваў узвесці збудаванне, якое нагадвала б карабель. І знайшоў падтрымку. Людзі сабралі грошы, купілі драўніну, зноў закіпела работа. Паступова з'явіліся барты, палуба, лесвіца, штурвал. «Сёння мала сказаць, што дзеці любяць гэты карабель, яны не вылазяць адсюль», — заўважыла староста Таццяна Камінская.

А старшыня сельскага Савета адзначыла, што ўзвядзенне і абсталяванне цэнтра грамадскага адпачынку паўплывала на атмасферу жыцця ў пасёлку. Людзі сталі больш дружнымі. Яны дамовіліся паміж сабой і ператварылі забалочаны ўчастак па вуліцы Новай у культурны вадаём. А потым узнікла ідэя побач з пляцоўкай узвесці сцэну, каб можна было праводзіць тут дні пасёлка, запрашаць артыстаў. Тады зноў спатрэбіўся вопыт дэпутата — спадарыні Сапяжынскай. І зноў атрымалі грант, сцэну пабудавалі. На яе адкрыцці на свята Пакроваў і Дня маці летась адбыўся першы канцэрт.

Мясцовае ж самакіраванне на гэтым не спыніла сваю работу, яно стала знаходзіць новыя формы. Зноў жа, з дапамогай гранта абсталявалі 11 навесаў у вёсках, дзе робяць прыпынкі аўтакрамы. Людзі цяпер не стаяць сярод вуліцы, а могуць пачакаць гандлёвую машыну ў больш камфортных умовах.

Новая ініцыятыва актыўных вяскоўцаў датычыцца лепшага асвятлення вуліц. Замену старых лямпачак на святлодыёдныя ліхтары пачалі ў вёсках Андронава, Батчы, Птушкафабрыка ў рамках экалагічнага праекта з еўрапейскай падтрымкай.

Матэрыялы падрыхтавала Святлана ЯСКЕВІЧ.

Банк торговый капитал
Закрытое акционерное общество

Наименование банка:

ЗАО «ТК Банк»

www.tcbank.by

Бухгалтерский баланс на 1 апреля 2019 г.

Наименование банка ЗАО «ТКБанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2019	01.01.2019
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	1 929	1 531
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	3 822	1 720
5	Средства в банках	1104	61 399	62 358
6	Ценные бумаги	1105	62 255	62 172
7	Кредиты клиентам	1106	1 805	1 517
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	5 923	5 923
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	23 667	23 486
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	22 946	23 022
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	6 667	7 327
13	Отложенные налоговые активы	1112	18	18
14	Прочие активы	1113	516	771
15	**ИТОГО активы**	**11**	**190 947**	**189 845**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	11 055	13 264
19	Средства клиентов	1203	8 570	9 512
20	Ценные бумаги банка	1204	-	-
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	964	361
24	**ВСЕГО обязательства**	**120**	**20 589**	**23 137**
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	61 651	61 651
27	Эмиссионный доход	1212	17	17
28	Резервный фонд	1213	19 953	18 753
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	1 224	1 326
30	Накопленная прибыль	1215	87 513	84 961
31	**ВСЕГО собственный капитал**	**121**	**170 358**	**166 708**
32	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**	**190 947**	**189 845**

Отчет о прибылях и убытках на 1 апреля 2019 г.

Наименование банка ЗАО «ТКБанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2019	01.04.2018
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	1 786	2 790
2	Процентные расходы	2012	4	8
3	Чистые процентные доходы	201	1 782	2 782
4	Комиссионные доходы	2021	25	28
5	Комиссионные расходы	2022	32	50
6	Чистые комиссионные доходы	202	(7)	(22)
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	955	(1 613)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(402)	(327)
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	(2 718)	(2 130)
12	Прочие доходы	208	1 431	4 246
13	Операционные расходы	209	2 438	5 591
14	Прочие расходы	210	-	57
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	4 039	1 548
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	421	386
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**	**3 618**	**1 162**

Председатель Правления С.Ф. Хайновский

Главный бухгалтер Н.А. Тиванова

Дата подписания: 2 апреля 2019 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, №30 от 19.06.2013, БИК 153001333, УНП 807000163.

УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 31.05.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Примшиц Н. П.

Легковой джип «Ауди Q7», 2006 г. в., дизель, начальной стоимостью 19 700 рублей, прицеп «МТЗ П05», 1998 г. в., начальной стоимостью 300 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809 УНП 190431606

ЛАБАРАТОРЫЯ СОНЦА НА ФОНЕ СТАРОГА САДУ

З ГІСТОРЫІ ПЫТАННЯ

Пачаць варта з гісторыі. Актыўная работа па паляпшэнні знешняга выгляду пачалася ў Відамлі з прыходам у тутэйшы калгас «Кастрычнік» на пасаду **старшыні Міхаіла СТРАПКО.** Забягаючы наперад, адзначу, што Міхаіл Мікалаевіч тры скліканні запар быў дэпутатам абласнога Савета. Спецыяліст, які прайшоў «школу» двойчы Героя Сацыялістычнай Працы Уладзіміра Бядулі, Міхаіл Страпко прывык усё рабіць грунтоўна і звяртаць увагу не толькі на вытворчыя паказчыкі. А тое, што ўбачыў новы старшыня ў цэнтры вёскі, праз якую праходзіць рэспубліканская дарога на Белавежскую пушчу, яго, вядома, не ўзрадавала. Побач з адміністрацыйнымі будынкамі, крамамі разрасліся старыя дрэвы, хмызняк, іх трэба было прыбіраць. Статак свойскіх кароў праходзіў праз цэнтр вёскі некалькі разоў на дзень з усімі наступствамі для дарогі.

Першае, з чаго пачаў новы старшыня, — навядзенне парадку на тэрыторыі. Прыбралі каля канторы, зрэзалі старыя дрэвы і кусты, пачалі высаджваць кветкі... Пенсіянеры з найбліжэйшых дамоў прыходзілі, цікавіліся, давалі парады.

Тады ж сельвыканкам разам са старастам вёскі прапанаваў вясковым жыхарам раздзяліць статак на два. Відамля — населены пункт, выцягнуты ўздоўж дарогі. І такі варыянт выглядаў выйсцем у справе падтрымання парадку. Хаця б цэнтральная частка заўсёды заставалася б чыстай. Правялі сходы, пагутарылі з людзьмі, асноўная частка насельніцтва ідэю падтрымала. Але знайшліся і тыя, хто не згаджаўся. Зноў і зноў даводзілася гутарыць, пераконваць. Жыхары вёскі паступова звыкаліся з думкай, што прыгажосць дасягаецца агульнымі намаганнямі.

НАСТРОЙ НА ПАЗІТЫЎ

З часам у гаспадарцы паявілася штатная адзінка — работнік па азеляненні. На гэта месца ўзялі не першага чалавека, які трапіў пад руку, а таго, хто ўмее даглядаць і любіць расліны. Менавіта Таццяна Логаш цяпер адказвае за прыгажосць у Відамлі. А вясной ці восенню на дапамогу выходзяць работнікі адміністрацыі гаспадаркі, спецыялісты сельсавета.

Кожны год у Відамлі паяўляецца нешта новае: кусты ядлоўцу, кіпарысавыя расліны. А недарагія самшыты, напрыклад, знайшліся ў Кобрынскім раёне — іх адразу купілі цэлую машыну. Міхаіл Страпко кажа, што гэта не проста хобі, а частка вытворчай стратэгіі:

— Вось прыязджаюць на працу маладыя спецыялісты. Хто з іх захоча застацца ў недагледжанай закінутай вёсцы? Далей: кожны дзень на працу прыходзяць механізатары, кіроўцы, іншыя работнікі. Яны бачаць не засмечаныя гаспадарчыя і машынныя двары, а парадак на тэрыторыі, клумбы з кветкамі, якія радуюць вока. Гэта міжволі настройвае чалавека на пазітыў. Аказалася, што стварыць прыгожы куточак каля кожнага са складоў не з'яўляецца праблемай. Заўсёды знойдзецца чалавек, які гэта любіць. На тэрыторыі збожжатока жанчыны здолелі так размясціць куточкі з кветкамі, што яны відаць адусюль. Зойдзеш падчас уборкі, тоны збожжа кругом ляжаць, а побач абавязкова нешта цвіце. Самі работнікі кажуць, што гэта спрыяе добраму настрою.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Калі да гаспадаркі далучылі дзве суседнія, на аддаленых фермах захапленне падтрымалі. Аднойчы на адной з такіх фермаў кветкі пабіў град. «Прыязджаю, а жанчыны ледзь не плачуць, — расказваў Міхаіл Мікалаевіч. — Прывезлі ім новыя расліны, паправілі клумбы. Мяне ж парадавала, што людзі аказаліся чуйнымі да прыгажосці».

КОНКУРС-АГЛЯД

З гадамі ў вёсцы станавілася ўсё болей добраўпарадкаваных і ўпрыгожаных сядзіб. Потым у практыку ўвайшло спаборніцтва на найлепшую сядзібу. Паступова гэта ўжо стала нормай грамадскага жыцця, нікога асабліва не трэба агітаваць альбо прымушаць, — канстатуе **старшыня сельскага Савета Марына КАРАЛЮК.** — Вяскоўцы захапіліся ідэяй упрыгожвання свайго побыту. Кожнае лета камісія сельскага Савета абыходзіць падворкі, робіць фотаздымкі, каб зімой падчас падвядзення вынікаў афарміць стэнды і прадставіць дакументальныя сведчанні намаганняў пераможцаў.

Вынікі падводзяць сумесна сельскі Савет і адкрытае акцыянернае таварыства «Відамлянскае». Нават падзячныя лісты падпісваюць два кіраўнікі. Праводзіцца ўрачыстае мерапрыемства, дзе ўшаноўваюць перадавікоў мінулага года. У зале ладзіцца фотавыстаўка, падчас якой нярэдка можна пачуць: «Няўжо так прыгожа было ў маім дварэ?»

Вялікая заслуга ў справах добраўпарадкавання на рахунку мясцовай школы. Зараз тут вырошчваецца да 90 працэнтаў расады аднагадовых раслін, якія ўвесь сезон упрыгожваюць вуліцы і плошчы вёскі. Школа падтрымлівае ў парадку не толькі сваю тэрыторыю, але і даволі вялікую прыдарожную паласу. Тут з'явіліся прыгожыя арыгінальныя клумбы, якія час ад часу мяняюць форму і колеравую гаму.

Цікавая гісторыя з клумбай у выглядзе зубра. Яе ўладкавалі на ўзбочыне дарогі на Белавежскую пушчу. Некалькі сезонаў квітнела рознымі краскамі, а потым вырашылі па звычцы памяняць яе форму на іншую. Але нехта з настаўнікаў заўважыў, што менавіта каля гэтай клумбы больш за ўсё фатаграфуецца турыстаў. І яна тут вельмі дарэчы, бо мае брэндавае значэнне. «Выйшла як з той Эйфелевай вежай, — жартуе **дырэктар школы Тамара СТРАПКО.** — Будавалі на час выстаўкі, потым хацелі разбурыць, а аказалася, што вежа — ужо славутасць. Так і наш зубр: мы яго пакінулі, толькі кожны сезон напаўняем новымі адценнямі». Школа даглядае ладны кавалак прыдарожнай паласы, тэрыторыю царквы, падтрымлівае ва ўзорным парадку ўласны двор.

ФЕСТЫВАЛЬ МАЛЫХ ВЁСАК

Акрамя Відамлі ў склад сельсавета ўваходзіць нямала малых вёсак. Каб іх падтрымаць, у тым ліку ў плане добраўпарадкавання, задумалі фестываль малых вёсак пад назвай «Вёсачка мая — мая чараўніца». Кожны год у адным з такіх населеных пунктаў праводзіцца свята вёскі, да якога ідзе падрыхтоўка фактычна цэлы год. А на вясковы фэст збіраюцца ўсе пакаленні вяскоўцаў, дзеці-ўнукі прыязджаюць нават здалёк. Сельгаспрадпрыемства не абыходзіць увагай ніводнага былога работніка, падарункі адрасуюцца ўсім калгасным пенсіянерам. Гаспадыні дастаюць з куфраў вышыванкі і посцілкі, дэманструюць таленты кулінарыі. Усе, як адно, святы: «Грушаўскі світанак», «Баранкаўскі завітанак», «Млыноўскі беражок», «Куфар Радасці», «Гасцёўня на Лясной», «Мядовы чай на Панскім», — прайшлі вельмі душэўна, цікава, пакінулі іх удзельнікам незабыўныя эмоцыі. У сельскім Савеце захоўваюцца відэаматэрыялы, цэлыя альбомы са здымкамі з тых мерапрыемстваў, там цэлы стос падзячных водгукаў найбольш ад нашчадкаў жыхароў, якія выбраліся на свята і сустрэліся з аднакласнікамі, аднавяскоўцамі, акунуліся ў сваё юнацтва.

РЭКРЭАЦЫЙНАЯ І НАВУЧАЛЬНАЯ

Асобна варта сказаць аб праекце, які ажыццявілі ў Відамлі летась. У цэнтры вёскі паявілася рэкрэацыйна-навучальная пляцоўка «Лабараторыя сонца». Пачыналася, як заўсёды, з ініцыятывы нераўнадушных жыхароў. Спачатку за адміністрацыйным будынкам уладкавалі стары сад. Яго пачысцілі, абнавілі. Старыя неаварыйныя дрэвы пакінулі, дабавілі новых, сад ажыў. Потым сельскі Савет аформіў свае намеры дакументальна і выйграў грант на конкурсе мясцовых ініцыятыў «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні». На атрыманыя грошы, а гэта 27 тысяч долараў, пабудавалі пешаходныя дарожкі, устанавілі сем свяцільнікаў, чатыры сонечныя панэлі і два стэнды па энергазберажэнні. Тут размяшчаецца інфармацыя на тэму эканоміі і беражлівасці.

Энергіі ад сонечных батарэй хапае, каб асвятляць названую пляцоўку круглы год. Тут жа ўсталяваны разеткі для зарадкі мабільных прылад. Адпачываеш і зараджаеш тэлефон альбо планшэт. За кошт сельвыканкама на пляцоўцы паставілі садовыя лаўкі. Людзі ацанілі іх як выдатнае месца для адпачынку. Сталі прыходзіць, каб пасядзець, палюбавацца садам. Але адразу склалася ўражанне, што чагосьці не хапае, бо на пляцоўку пацягнуліся сем'і з дзецьмі. Так, у цэнтры зоны адпачынку проста прасілася дзіцячая пляцоўка. Гэта заўважыў і старшыня Камянецкага райвыканкама, калі заехаў падчас работ па ўзвядзенні «Лабараторыі сонца». І менавіта з дапамогай выканкама дзіцячая пляцоўка неўзабаве паявілася. З якім захапленнем прыходзілі сюды дзеці, асабліва на самым пачатку!

— Адным словам, добрую справу адолелі ўсёй грамадой, — падсумоўвае **старшыня сельскага Савета Марына КАРАЛЮК.** — Самую вялікую падтрымку аказалі ААТ «Відамлянскае», ААТ «Агра-Турна», ДРСУ-137 і многія жыхары вёскі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НА КІМ ТРЫМАЕЦЦА ВЁСКА?

«Як на работу ходзіць»

Староста з Горталя стала сапраўдным лідарам і арганізатарам у вялікай вёсцы

Старшыня Івацэвіцкага раённага Савета Аляксандр САРОКА расказаў пра сваю першую сустрэчу са старастам Горталя Валянцінай Якімовіч і сваё здзіўленне. Аляксандр Фёдаравіч праязджаў міма могілак, убачыў, як людзі вясной дружна наводзяць парадак, прыпыніўся, рашыў пагаварыць. Падышоў і стаў сведкам прыкладна такога дыялогу : «У цябе, Васіль, ёсць конь, а ты без каня прыйшоў, то ідзі запрагай. А ты, Іван, трактар свой падгані, трэба вывезці пні, адходы пасля спілоўвання. Вы, жанчынкі, потым прыбераце свае магілы, спачатку трэба вунь тыя, да якіх ужо ніхто не прыязджае. Вы, дзеткі, ідзіце да ваенных пахаванняў, там парадак наводзьце. А вы, мужчыны, вунь тыя кусты ссячыце!» У адказ людзі толькі ўдакладняюць дэталі ды бяруцца за работу. «І гэта, заўважце, не калгасны брыгадзір на зарплаце, што камандуе сваімі работнікамі, якія таксама зарплату атрымліваюць. Чалавек так займаецца грамадскай работай», — падсумаваў старшыня.

Законны статус

А ў Горталі гэта ўсім прывычна. Валянціну Аляксееўну даўно прызнаюць за лідара. Некалі яна працавала ў Гортальскім сельскім Савеце. Потым яго скасавалі і далучылі да Целяханскага. Яна перайшла туды на пасаду сакратара, па-цяперашняму кіраўніка справамі. Жыла тут, і па звычцы ўсе людзі па любым пытанні звярталіся да яе: каму патрэбная даведка, каму спатрэбілася аформіць спадчыну, а каму і хатняга дэбашыра прыйшоў час накіраваць у лячэбна-прафілактычную ўстанову. Усім гэтым займалася, многім людзям дапамагала. А калі выйшла на пенсію ў 2006 годзе, вяскоўцы нават асабліва не думалі, на сходзе сказалі: «Ты, Аляксееўна, у нас, па сутнасці, староста, а калі трэба, то і прагаласуем». І прагаласавалі, надалі законны статус.

Першай агульнай работай была ўстаноўка новай агароджы на могілках. Сабралі грошы, купілі бетонныя пралёты, паставілі, пафарбавалі. Але галоўнай справай, якую яны зрабілі ўсёй вёскай разам, стала ўзвядзенне свайго храма. Раней царквы тут не было. Мясцовыя людзі хадзілі ў Целяханы, амаль тысячны Горталь адносіўся да Целяханскага прыхода. Потым нешта змянілася ў царкоўным размеркаванні, і вёску аднеслі да Выганашчанскага прыхода, а гэта амаль 10 кіламетраў.

Галоўны праект — царква

Да Валянціны Якімовіч прыйшла цэлая дэлегацыя жыхароў вёскі, амаль з парога людзі заявілі, што трэба будаваць свой храм. Яна тады крыху разгубілася. А як гэта: будаваць царкву? З чаго пачынаць, куды звяртацца? І варта сказаць, спачатку ідэю далёка не ўсе падтрымалі. Некаторыя абураліся: «Вы хоць уяўляеце, колькі гэта будзе каштаваць?! Гэта ж не лазню, нават не жылы дом узвесці. Дзе ўзяць столькі грошай?» Тады яна патэлефанавала ў Пінск уладыку Стэфану, назвала сябе, расказала, што людзі хочуць мець сваю царкву ў вёсцы. Уладыка параіў збіраць агульны сход, запрашаць святароў. Абяцаў блаславіць таго свяшчэнніка, які возьмецца за гэтую справу. На сходзе, як той казаў, было горача. Розныя думкі і апасенні выказваліся. Але ж грамада рашыла: будаваць. Айцец Мікалай Выганашчаў згадзіўся ўзяцца за справу будаўніцтва. Людзі зразумелі, што галоўнай крыніцай фінансавання будуць ахвяраванні. Таму складалі спісы па вуліцах і кожны месяц уносілі пасільную суму. Праўда, пашанцавала, што ўчастак расчысціў пад будоўлю і заліў фундамент прадпрымальнік. Спачатку ён думаў тут будаваць кавярню з крамай. Потым нешта пайшло не так, чалавек ад ўзвядзення аб'екта адмовіўся, а фундамент ахвяраваў на храм.

Будаўніцтва вялося восем гадоў. Грошай не хапала. Тады бацюшка ўзяў у арэнду кавалак зямлі, сталі вырошчваць агародніну, прадаваць, атрымалі пэўны даход.

— Так з Божай дапамогай выросла наша цэркаўка. Зараз там службы ідуць, але працягваецца работа па добраўпарадкаванні, рыхтуем храм да асвячэння. А тыя, хто лічыў, што мы ўвязваемся ў авантуру, цяпер прабачэння прасілі ў грамады. Мы рады, што ёсць царква і ўсе святы мы можам адзначаць фактычна дома, а не ехаць за дзесяць кіламетраў, — кажа староста.

Валянціна ЯКІМОВІЧ.

Пахаванні Першай сусветнай

Цяпер яна з актывістамі, мясцовай уладай, спонсарамі ўзялася яшчэ за адну, несумненна, богаўгодную справу. Гаворка аб тым, што на гортальскіх могілках ёсць пахаванне не менш чым дзвюх тысяч салдат расійскай арміі часоў Першай сусветнай вайны. Па беразе Агінскага канала праходзіла лінія фронту. Баявалі тут больш за год, баі былі жорсткія і працяглыя. Вось і хавалі ўсіх загінулых у адным месцы. Не так даўно ў вёску прыязджалі актывісты Пінскага гістарычнага клуба «Пошук». З іх дапамогай быў афармлены запыт у расійскія архівы. Несумненна, цікава было б высветліць хоць некаторыя імёны, можа, знайшліся б нашчадкі тых воінаў, што назаўсёды засталіся ў гортальскай зямлі. А пакуль што восенню Валянціна Аляксееўна арганізавала суботнік. Прыехалі вяскоўцы са сваімі трактарамі, вывезлі пні і іншыя адходы, што ўтварыліся пры расчыстцы. Потым тэрыторыю разраўнялі. Паставілі крыж і сціплы знак на месцы пахавання. Сёлета запланавалі ўстанавіць агароджу і далейшае добраўпарадкаванне тэрыторыі пахавання.

Зараз у вёсцы вясновыя клопаты. Хутка прыйдзе час дзяліць участкі пад пасадку бульбы. Валянціна Аляксееўна шмат гадоў узначальвае адпаведную камісію. А потым — сенажаці, выпас кароў, копка бульбы.

Словам і справай

Але галоўным у сваёй рабоце яна лічыць нават не вялікія, агульныя справы, пра якія ішла гаворка вышэй, а штодзённыя стасункі з людзьмі. На пахаванні землякоў староста заўсёды прысутнічае, да гэтага ўсе прывыклі. Нават даводзілася самой разам з сацыяльным работнікам арганізоўваць пахаванне адзінокага чалавека. Нядаўна вось сустрэла яе вельмі пажылая пенсіянерка і раптам расплакалася, сказала, што ёй ніхто ў жыцці такіх харошых слоў не адрасаваў. А ўсяго толькі на 80-гадовы юбілей жанчыны староста накіравала ёй паштоўку з цёплым віншаваннем. «Вось, аказваецца, якое важнае своечасовае слова ўвагі, а раней аб гэтым не думалася, — разважае Валянціна Якімовіч. — Як у выпадку з гэтай простай жанчынай, якая ўсё жыццё толькі працавала, якой, можа, не надта пашанцавала з роднымі. Добра, што сёлета мясцовая гаспадарка ў калектыўны дагавор унесла палажэнне аб віншаванні ветэранаў: 80-, 85- і 90-гадовых».

Каля дзіцячага садка заводжу размову з маладымі жанчынамі пра старасту:

— У нас у вёсцы дакладна ўлада ёсць, — кажа Святлана Марзан, загадчыца дзіцячага садка. — Ніводная значная падзея не абыходзіцца без Валянціны Аляксееўны. — Летась у доме 90-гадовай жанчыны здарыўся пажар. Яна з унукам жыве. Дык староста адразу арганізавала збор грошай. Ім дапамаглі. А яшчэ раней адну шматдзетную сям'ю напаткала бяда. Дзіця цяжка захварэла. Трэба было рэгулярна вазіць на лячэнне ў Бараўляны. Староста адразу пайшла па дамах, сабралі патрэбную суму, каб падтрымаць сям'ю. Радасць цяпер для ўсіх, што хлопчык пайшоў на папраўку...

— Гэта талент трэба мець, каб так арганізоўваць людзей, — падтрымліваюць Святлану Іванаўну іншыя суразмоўніцы. — Неяк прыходзім у магазін, Валянціна Аляксееўна прапануе ўсім пакупнікам рабіць унёсак на ёлачныя ўпрыгажэнні. Ёлку ставім у цэнтры шмат гадоў, а цацкі ж трэба абнаўляць. Вось так за дзень на адну гірлянду збярэ. Мы ў садку таксама выробляем цацкі. Так разам і ўпрыгожваем ёлку, потым разам святкуем.

— Важна, што Валянціна Якімовіч раней працавала ў сельскім органе ўлады і мела аўтарытэт сярод вяскоўцаў. Гэты аўтарытэт цяпер дапамагае ў рабоце. Ну яшчэ: прыродныя арганізатарскія здольнасці, добрая ўласная сям'я як прыклад для іншых — вось рэцэпт паспяховага старасты. Яна кожны дзень на сваёй грамадскай працы, нібы на работу ходзіць, — сказаў **старшыня раённага Савета дэпутатаў Аляксандр САРОКА.**

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

Совместное белорусско-российское открытое акционерное общество «Белгазпромбанк»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2.
Телефон для справок: 120

Данная отчетность опубликована на сайте ОАО «Белгазпромбанк» www.belgazprombank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 АПРЕЛЯ 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2019 год	2018 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		80 374	86 278
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		544	614
4	Средства в Национальном банке	1103		833 403	385 970
5	Средства в банках	1104		252 717	205 402
6	Ценные бумаги	1105		990 884	898 898
7	Кредиты клиентам	1106		2 640 203	2 744 048
8	Производные финансовые активы	1107		4 918	6 656
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		665	665
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		169 529	183 625
11	Доходные вложения в материальные активы	1110		13 055	288
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111		986	1 544
13	Отложенные налоговые активы	1112		-	-
14	Прочие активы	1113		29 011	26 390
15	**ИТОГО активы**	**11**		**5 016 289**	**4 540 378**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
17	Средства Национального банка	1201		-	41
18	Средства банков	1202		892 590	957 226
19	Средства клиентов	1203		3 330 853	2 810 979
20	Ценные бумаги банка	1204		79 738	50 192
21	Производные финансовые обязательства	1205		702	960
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
23	Прочие обязательства	1207		79 086	36 197
24	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**4 382 969**	**3 855 595**
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
26	Уставный фонд	1211		348 161	348 161
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213		72 024	52 350
29	Фонды переоценки статей баланса	1214		18 005	16 244
30	Накопленная прибыль	1215		195 130	268 028
31	**ВСЕГО собственный капитал**	**121**		**633 320**	**684 783**
32	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**5 016 289**	**4 540 378**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ НА 1 АПРЕЛЯ 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2019 год	2018 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		73 602	84 820
2	Процентные расходы	2012		32 357	32 266
3	*Чистые процентные доходы*	201		41 245	52 554
4	Комиссионные доходы	2021		24 027	23 740
5	Комиссионные расходы	2022		6 884	5 520
6	*Чистые комиссионные доходы*	202		17 143	18 220
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		(1 614)	(479)
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		2 101	(749)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		8 365	7 629
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		1 067	442
11	Чистые отчисления в резервы	207		12 210	10 244
12	Прочие доходы	208		7 387	2 753
13	Операционные расходы	209		53 021	59 670
14	Прочие расходы	210		2 079	1 797
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		8 384	8 659
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		3 707	4 225
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**4 677**	**4 434**

Председатель правления В.Д. Бабарико

Главный бухгалтер Н.М. Дылевская

Дата подписания: 5 апреля 2019 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности №8 выдана Национальным банком Республики Беларусь 24.05.2013. УНП 100429079

Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» сообщает о снятии с аукционных торгов 30 апреля 2019 года объекта производственного назначения на участке У-2 по ул. Гаражная в г. Гродно (лот № 7) УНП 590727594

Продаю: недорого пчелосемьи, пчелопакеты. Тел.: 8 029 126 23 32, 8 044 736 20 62

Шукаеце работу? Запрашаем на кірмаш!

У Мінску 25 красавіка ў межах агульнарэспубліканскага адзінага дня занятасці пройдзе гарадскі кірмаш вакансій.

Як паведамляе камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, галоўная мэта кірмашу — садзейнічаць у пошуку работы тым, хто мае ў гэтым патрэбу, а найменш — дапамагчы ў падборы кадраў.

Плануецца, што ў ім прымуць удзел больш за 80 прадпрыемстваў і арганізацый сталіцы, якія прапануюць саіскальнікам свае вакансіі для працаўладкавання. У непасрэдных зносінах з наймальнікамі людзі атрымаюць інфармацыю аб прапануемай рабоце, узроўні заробку і кваліфікацыйных патрабаваннях да патэнцыйных кандыдатаў. На кірмашы будуць прадстаўлены прапановы працаўладкавання ў розных сферах дзейнасці: прамысловасці, будаўніцтве, транспарце, гандлі і грамадскім харчаванні, ахове здароўя ды іншых галінах.

На кірмашы спецыялісты камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама будуць кансультаваць наведвальнікаў па пытаннях заканадаўства аб занятасці, стратэгіі пошуку работы і складанню канкурэнтаздольнага рэзюмэ. А яшчэ будуць працаваць профільныя секцыі: «Пачнем бізнес разам», «Стратэгія выбару прафесіі», «Старт у працоўнае жыццё», «Занятасць без межаў» ды іншыя.

Напрыклад, у межах работы секцыі **«Пачнем бізнес разам»** тыя, хто хоча самастойна распачаць сваю справу, атрымаюць кампетэнтныя кансультацыі дасведчаных спецыялістаў па пытаннях арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці і атрыманні фінансавай дапамогі з розных крыніц.

Псіхолагі Мінскага гарадскога цэнтра абслугоўвання сям'і і дзяцей на секцыі **«Стратэгія выбару прафесіі»** будуць кансультаваць наведвальнікаў, што знаходзяцца ў складаным жыццёвым становішчы. Прадстаўнікі БРСМ на секцыі **«Старт у працоўнае жыццё»** раскажуць навучэнцам і студэнтам аб магчымасцях удзелу ў студэнцкіх атрадах, у другаснай занятасці.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Карысным для саіскальнікаў з абмежаванымі магчымасцямі стане наведванне секцыі **«Занятасць без межаў»**. У яе рабоце прымуць удзел арганізацыі, якія прапануюць вакансіі для тых, хто мае абмежаванні па стане свайго здароўя. Тут можна будзе атрымаць інфармацыю аб магчымасцях працаўладкавання, прайсці гутарку з наймальнікам.

Яшчэ адной цікавай секцыяй можа стаць **«Навучанне з гарантаваным працаўладкаваннем»**. У ёй прымуць удзел сталічныя арганізацыі, якія гарантуюць месца беспрацоўным, накіраваным на навучанне органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, пасля завяршэння імі поўнага курса навучання.

Секцыя **«Формула паспяховай кар'еры»** пазнаёміць наведвальнікаў кірмашу з прадстаўнікамі буйных кампаній Мінска, якія раскажуць аб сваёй кадравай палітыцы, магчымасцях кар'ернага росту, навучання на прадпрыемстве. А на секцыі **«Вакансіі сёння і цяпер»** спецыялісты дзяржаўнай службы занятасці паведамяць аб магчымасцях працаўладкавання на часовыя, сезонныя работы, а таксама аб удзеле ў аплачваемых грамадскіх работах.

Дарэчы, усе паслугі аказваюцца бясплатна.

Па выніках кірмашу пройдзе круглы стол, на якім удзельнікі абмяркуюць тэндэнцыі на рынку працы сталіцы, арганізацыю часовай занятасці моладзі, а таксама выкананне наймальнікамі патрабаванняў заканадаўства аб занятасці насельніцтва.

Што? Кірмаш вакансій.

Дзе? Культурна-спартыўны цэнтр Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, Мінск, вуліца Чкалава, 7.

Калі? 25 красавіка з 10.00 да 13.00.

САДЗЕЙНІЧАННЕ ЗАНЯТАСЦІ

ВАРЫЯНТЫ ЁСЦЬ, АЛЕ ЖАДАННЯ ПРАЦАВАЦЬ НЯМА

Гэта, бадай, адна з асноўных праблем, з якімі даводзіцца сутыкацца ў дзейнасці пастаянна дзеючай камісіі па садзейнічанні занятасці насельніцтва Пінскага гарвыканкама. Кіруе ёю старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Лявонцій ЛЕМЯШЭЎСКІ.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Як паведамляе «Пінскі веснік», сапраўды, варыянты працаўладкавання ёсць, паколькі на рынку працы ў Пінску намеціліся станоўчыя тэндэнцыі. Так, вырасла колькасць пінчукоў, занятых у эканоміцы горада, тэмп росту склаў 100,2 %. Знізіўся каэфіцыент напружанасці: калі на 1 студзеня 2018 года на адну вакансію прыпадала 0,8 беспрацоўнага, то на 1 студзеня 2019-га — 0,4. Летась у 1,3 раза скараціласа колькасць тых, хто працуе ў рэжыме вымушанай няпоўнай занятасці. Яшчэ вельмі важная дэталь: упершыню за апошнія некалькі гадоў у Пінску колькасць прынятых на работу людзей перавысіла колькасць звольненых.

Вось толькі не заўсёды ў беспрацоўных ёсць жаданне працаваць. З розных прычын: хтосьці, працуючы, як той казаў, на сябе, не жадае выходзіць «з ценю» і плаціць падаткі; у кагосьці — вельмі нізкая матывацыя шукаць работу.

— Для садзейнічання ў працаўладкаванні ў камісію звярнуліся 54 пінчукі, — расказвае **сакратар камісіі Таццяна БОГАЛЬ.** — Яны былі накіраваны ў службу занятасці, аднак прапанаванымі вакансіямі, якіх, дарэчы, больш за 700, прычым больш за 79 % — па рабочых прафесіях, скарысталіся далёка не ўсе. Між тым прадпрыемствы гатовы сёння працаўладкоўваць людзей з навучаннем на рабочым месцы. На пасяджэннях камісіі прадстаўнікі кадравых службаў прапануюць беспрацоўным варыянты працаўладкавання. Вось і на апошнім пасяджэнні, напрыклад, пяцярым грамадзянам, якія вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі, прапанавалі вакансіі. У выніку дайшлі да наймальніка і працаўладкаваліся толькі двое з іх.

Працаўладкаванымі, як вядома, лічацца і самазанятыя. У Пінску летась «самазаняліся» 1836 чалавек — у два з паловай разы больш, чым, напрыклад, у Баранавічах. 75 % працуюць у сферы гандлю, у асноўным вырошчваюць і рэалізуюць плодаагароднінную і кветкавую прадукцыю. Аказваюць яны таксама рэпетытарскія, будаўнічыя, цырульніцкія паслугі, фота- і відэаздымкі.

— З пачатку бягучага года ў інспекцыі па падатках і зборах па Пінску зарэгістравана 708 фізічных асоб, якія займаюцца рамеснай дзейнасцю, што на 20,6 % больш, чым у 2018-м, — працягвае суразмоўніца. — Адпаведна, назіраецца і рост плацяжоў у рамках выплаты збору за права ажыццяўлення такой дзейнасці.

Асноўная задача камісіі, зразумела, садзейнічаць людзям працаздольнага ўзросту ў працаўладкаванні, арыентаваць іх на легальную працоўную дзейнасць. Але ёсць і маса іншых задач. Сярод іх — фарміраванне спісу працаздольных грамадзян, якія не занятыя ў эканоміцы і павінны аплачваць шэраг жыллёва-камунальных паслуг «напоўніцу».

— Пасля 1 снежня мінулага года, калі была сфарміравана база даных пінчукоў, якія не занятыя ў эканоміцы, для нас самым важным было якасна адпрацаваць і вывярыць даныя, каб ні адзін чалавек не трапіў у яе памылкова, — удакладняе Таццяна Уладзіміраўна. — У выніку ў базе засталося больш за адзінаццаць з паловай тысяч гараджан. З іх, як высветлілася, звыш трох тысяч з'яўляюцца плацельшчыкамі жыллёва-камунальных паслуг. Намі была праведзена велізарная растлумачальная работа. Мы распрацавалі алгарытм дзеянняў чалавека, які можа быць аднесены да занятых у эканоміцы: скажам, калі ён працуе ці вучыцца за мяжой альбо калі з ім, напрыклад, спынены працоўныя адносіны і гэтак далей, — вызначаны цэлы пералік катэгорый такіх грамадзян. Дык вось, у гэтым выпадку ў алгарытме выразна прапісана, якія чалавек павінен прадставіць пацвярджальныя дакументы. Калі ён працуе за мяжой, ад яго запатрабуецца дагавор або кантракт з замежным наймальнікам. У выніку 85 % пінчукоў пацвердзілі сваю занятасць, на працягу лютага — яшчэ каля трохсот чалавек. Хтосьці апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, што было прызнана і камісіяй. Такім чынам, у базе засталіся 452 чалавекі, якія павінны аплачваць паслугу гарачага водазабеспячэння па тарыфе, што забяспечвае поўнае пакрыццё выдаткаў на яе аказанне. Гэты спіс мы накіравалі ў разліково-даведачныя цэнтры для налічэння платы за жыллёва-камунальныя паслугі за люты з улікам пераразліку за студзень 2019 года.

Наколькі адчувальным будзе павелічэнне платы за «камуналку», залежыць канкрэтна ад кожнага спажыўца — ад таго, колькі расходуе вады, ці жывуць з ім і ці працуюць члены сям'і і гэтак далей.

Як высветлілася, 365 пінчукоў са спісу незанятых у эканоміцы на сённяшні дзень ужо аплацілі камунальныя паслугі, у тым ліку «па поўнай» — гарачае водазабеспячэнне. Астатнія пакуль рабіць гэта не спяшаюцца, як не імкнуцца і працаўладкоўвацца.

Але далей «раскашэльвацца» прыйдзецца яшчэ больш. Як вядома, да паслуг гарачага водазабеспячэння з 1кастрычніка дадаюцца яшчэ паслугі цеплазабеспячэння і газазабеспячэння пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў, якія таксама трэба будзе аплачваць па тарыфах, што забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат на іх аказанне. Там, зразумела, гаворка будзе ісці ўжо пра зусім іншыя сумы.

❍ У тэму

Беспрацоўных у Баранавічах навучаць новым спецыяльнасцям

Як паведамляе раённая газета «Наш край», упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне правядзіць набор слухачоў на навучальны курс «Асновы прадпрымальніцкай дзейнасці».

Усім, хто праслухае курс, акажуць садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама ў сферы аграэкатурызму і рамеснай дзейнасці.

Акрамя гэтага, праводзіцца набор слухачоў на II квартал 2019 года ў групы для прафесійнага навучання беспрацоўных і не занятых у эканоміцы грамадзян. На курсах можна атрымаць такія спецыяльнасці, як кухар, швачка, станочнік дрэваапрацоўчых станкоў, электраманцёр, тынкоўшчык, прадавец, візажыст, майстар па манікюры (педыкюры) ды іншыя. Тэрміны навучання розныя — ад месяца да паўгода.

Вучоба праходзіць у дзяржаўных навучальных установах райцэнтра, падчас яе выплачваецца стыпендыя. Па інфармацыю звяртацца: Баранавічы, вуліца Грыбаедава, 12, кабінеты № 5, № 28 або па тэлефонах: 64-08-69, 45-45-73, 45-44-60.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 18 красавіка 2019 года.**